# ЯНТАРНЫЯ ВІРЫ

KAMUNIKAT.org

**ДЗМІТРЫЙ ШАТЫЛОВІЧ**

# ЯНТАРНЫЯ ВІРЫ

KAMUNIKAT.org

**Беласток 2007**



# УСПАМІНЫ

## ПРАДКАЗАННЕ

Як зорка бліснула здалёку
Алмазам таемным нямым,
Расказ ад маёй чорнавокай
Варожкі аб лёсе маім.
 Яна мне тады нашаптала,
 Што дзесь я ў вірах злых падзей
 Блукаць буду ў свеце няўдала
 Паміж непрыхільных людзей.
Што доўга ў казённых прытонах
Пазнаю я голад, бяду,
Прайду я па сцежках шалёных,
Дарогу дахаты знайду,
 Што потым спаткаю шатэнку,
 Яна пакахае мяне,
 Жыцця майго зменіць ацэнку,
 Хвалу ёй аддам, як княжне.
І з ёю я буду шчаслівы,
Што з ёю ствару я сям'ю,
Жыццё прабяжыць нам імклiва
Як дзесь у тэатры рэвю.
 Калі я вярнуўся з блукання,
 Прыехаў у родны дом свой,
 Не верыў я ўжо ў прадказанні,
 Варожкі цяпер нежывой.
Знайшоў я жыццёвую мэту,
Штогод быў бліжей да яе,
Змяняў я дзяўчыны штолета,
Так як змяняюць калье.
 Якіх я кахаў, то маўчалі,
 Што хочуць калісь быць са мной,
 Якія мяне пакахалі,
 То лёс раздзяліў нас з сабой.

Пасля прадказаная лёсам
З’явілася ціха, як сон,
Як стукнула мне дваццаць восем
Гадоў у жыцёвы разгон.
Тады я прыпомніў варожку,
І словы яе за сталом,
Жыццёвыя сцежкі, дарожкі,
Якія прайшоў я пяшком.

KAMUNIKAT.org

## БЕЛЬСК - ПАДЛЯШСКІ

Пабачыў я горад яшчэ прад вайною,
Гулялі па ім мы з экскурсіяй школьнай
Вясёлай вясенняю цёплай парою
З настаўнікам нашым разумным, свавольным.
    Я помню вітрыны жыдоўскія ў крамах,
    Царкву з агароджай і ратушу з пікай,
    Касцёл мураваны з жалезнаю брамай,
    Майстэрні, варштаты, вакзал невялікі.
І цераз гады два знайшоў я ў ім школу,
Я ездзіў туды цягніком кожны ранак,
Вучыўся, а потым вяртаўся вясёлы
З сябрамі дамоў да вясковых ляжанак.
    Пазнаў я тады беларускую мову,
    Асвойваў яе я з вялікім стараннем,
    Там вершы на ёй я пісаў выпадкова
    І ў насценгазету іх браў мой настаўнік.
Паспеў я закончыць тады там клас сёмы,
І грымнула раптам вайны кананада,
І вораг прыехаў да нас незнаёмы,
І стаў хутка ўводзіць фашысцкі парадак.
    Закрыў усе школы для нас грозны вораг,
    Пазналі тыды мы бяду і нядолю.
    І вось праз гады два  я ўбачыў зноў горад,
    Як немец мяне высылаў у няволю.
Адтуль ён завёў нас, як быдла, ў вагоны,
І вывез нас гвалтам да працы ў чужыну.
У Бельск я вярнуўся ў салдацкіх пагонах
У новую школу, як дзесь у гасціну.
    Папаў я ў гімназію з роднаю мовай,
    Закончыў вучобу там цераз паўгода,
    Бо польскія ўлады ліцэй паспяхова
    Закрылі для нас не пытаючы згоды.
Я ў польскі ліцэй там пайшоў нечакана,
Як здаў я ўсе іспыты без аблягчэння.
Вучыўся я ў ім, як на той час, старанна,
Атрымаўшы ў ім атэстат заканчэння.

Я жыў тры гады там ў прыватнай кватэры,
З сябрамі сваймі ў невялікім пакоі,
У вельмі прыемнай для ўсіх атмасферы,
У дружбе з усімі ў душэўным спакоі.
Пазнаў я там многа сяброў і сябровак,
Праз многа гадоў мы вялі перапіску,
Для ўсіх нас тады наша родная мова
Так блізкай была, як дзіцяці  калыска.

KAMUNIKAT.org

# ХАЦЕЎ Я ЗНОЎ ЦЯБЕ  СПАТКАЦЬ

***Галіне Артысевіч***

Хацеў  нядаўна я ізноў цябе спаткаць,
Пасляваенны час успомніць, нашу школу,
Сябровак нашых і знаёмых прыгадаць,
Як мы праводзілі калісь наш час вясёлы.
    Твой хатні нумар тэлефона я знайшоў,
    Званіў я на яго штодзень амаль паўгода,
    Хацеў пачуць я голас твой і пару слоў,
    Ён толькі выў, або маўчаў мне на нягоду.
Пасля са смуткам мне сказаў адзін сябрук,
Што ты аставіла ўжо свет наш нечакана,
Пакінуўшы яго раптоўна і без мук,
Калі вярнулася дамоў з-за акіяна.
    Наведала ты сына роднага свайго
    Далёкі шлях мог стаць прычынаю хваробы,
    І назаўсёды ты аставіла яго
    За акіянам у абставінах жалобы.
І смутна мне, што не сустрэну больш цябе
Ужо ніколі наяву на гэтым свеце,
Што ў бездань адышоў ужо твой карабель,
Што больш табе не пажадаю даўгалецця.
    Што прозвішчаў сябровак мне  неназавеш,
    Якія я зусім забыў на нашых здымках,
    Якія нам зрабіў фатограф на траве,
    Калі сядзелі мы там групаю ў абдымках.
Больш  не раскажаш мне, як стала ты ўдавой,
І як сама свайго ты выхавала сына,
Як з клінікі вярталася ты ледзь жывой,
Дзе ты штодзень лячыла не адну жанчыну.
    Па ўсіх турботах спі цяпер ты вечным сном,
    І хай табе нічога дрэннага не сніцца,
    А здымкі ўсе з табой уклаў я ў свой альбом,
    А за душу тваю ўсе будзем  мы маліцца.

## ЗАБЫТЫЯ

Шуміць паціху лес густы,
Шумяць тут сосны і кусты,
І толькі дзяцел лічыць час,
Або зязюля закукуе,
Ці нейкі звер перанaчуе,
Варона закрычыць падчас.
    Ляжаць магілы між кустоў
    Зарослыя травой густой,
    Ужо амаль не відна іх.
    Калісь людзей сюды прыгналі,
    І ўсіх  адразу расстралялі,
    І ўжо аб іх загінуў слых.
Ніхто не знае скуль яны,
Ніхто не знае іх віны,
За што спаткаў іх тут расстрэл.
Адкуль іх прывялі не знаюць,
Ніхто нікога не пытае
Аб колькасці  схаваных цел.
    Галіны дрэў не скажуць нам,
    Ці ксёндз курыў тут фіміям,
    Ці хтось малебен адслужыў.
    А карані высокіх соснаў
    Не скажуць ці яны галосна
    Крычалі, як іх вораг біў.
Расце спакойна тут трава,
З магіл узнікла мурава,
Пакрыў яе паўзмрочны цень.
Сукі на соснах гэта бачаць,
Смалою бурай горка плачуць,
Як прыйдзе светлы цёплы дзень.
    Аб іх не зналі сваякі,
    Што тут прыкрылі іх пяскі,
    Чакалі сем’і іх калісь,
    Напэўна доўга іх чакалі,
    Ды іх шукаць тады баялісь,
    І дачакаць іх не маглі.

# СІЛА БАЦЬКОЎСКАЙ ЗЯМЛІ

Ад роднай бацькоўскай чароўнай зямлі
Я сілы надоўга свае назапасіў,
Таму працярпеў я няволю калісь,
Вайны дзве пражыў на жыцця цяжкай трасе.
Мяне не зламалі ні гукі гармат,
Ні голад, ні ворага дзікія здзекі,
Меў сілы з вінтоўкай я, шэры салдат,
Прайсці на нагах шлях за фронтам далёкі.
Я потым адолеў вярнуцца дамоў
З зусім невядомай далёкай чужыны,
Да спаленай вёскі, ды вострай зімой,
Да вотчыны ўласнай, да роднай айчыны.
Тады сіла роднай бацкоўскай зямлі
Да працы і ў школы мяне скіравала,
Вучыўся, вясною араў зноў палі,
А летам збіраў ураджай вельмі дбала.
Набраўшы зноў сілы ад роднай зямлі,
Пайшоў я туды, дзе я ў белыя ночы
Мог бачыць Няву, як па ёй караблі
Праз мост разводны праплывалі ахвоча.
Адтуль я штолета вяртаўся дамоў
На роднай зямлі аднавіць свае крылы,
Назад я вяртаўся з энергіяй зноў,
І меў я ўвесь год на экзамены сілы.
Там, быццам у казцы, прайшлі пяць гадоў
Спакойна і міла без мук, і без стомы,
І я селянін, а вярнуўся дамоў
Адтуль з інжынера-магістра дыпломам.
І потым мне родная вёска, зямля
Давала шмат сілы ў жыцці маім новым,
Ды самае важнае, што мне дала:
Мае беларускія родныя словы.

## СІРАТА І ЯЕ МАТКА

У маленькім садку сірата нічыя
Тут жыве ўжо даўно без надзеі,
Што калісь хтось ёй скажа: ,,Вось мама твая!”
І яе ашчаслівіць, як Фея.
Ці калісь хтось ёй скажа, хто імя ёй даў?
Хто яе нарадзіў на свет божы?
Хто яе ў дом сірочы калісьці аддаў,
Ці сказаць ёй аб гэтым хтось можа?
Бо калісь у яе дзесьці матка была,
Ад дачкі адраклася без жалю,
Бо дзяўчынай прыйшла ў горад проста з сяла,
І мужчыну знайшла дзесь на балю.
Аддалася яму, ён аставіў яе
Па гадзіннай прыемнай прыгодзе,
Залівала пасля яна смуткі свае
Алкаголем пры кожнай нагодзе.
Як радзіла яе аддала медсястры,
На яе паглядзець не схацела,
І не знаюць сяброўкі яе і сябры,
Што яна ўжо дзіця сваё мела.
І вяселіцца часта на танцах яна,
Аддаецца за грошы мужчынам,
І праводзіць ўсю ноч з імі аж давідна,
Аб дачцы больш не ўспомніць хвіліну.
Нават ноччу не сніцца ёй сон аб малой,
Аб сіротцы бацькамі забытай.
І сумлення яе не нарушыць спакой
Чуццё горычы з дзён перажытых.

# ПАХ РОДНАЙ ЗЯМЛІ

Як пахне прыемна зямля тут вясною,
Калі я прыйшоў на яе паглядзець,
Калі зелянеюць палі ярыною,
І жоўтай лістоты не бачу нідзе.
    А вецер прыносіць з ваколіцы цэлай
    Чароўныя пахі ўсіх кветак зямлі,
    І з музыкай лесу і з птушак капэлай,
    Мяне, як віно, ап’яняюць палі.
Я помню, як я іх араў і скародзіў,
Я пах гэты помню яшчэ з той пары,
Я знаў пахі кветак ва ўсім агародзе,
Я чуў пахі з лесу сасновай кары.
    Цяпер тыя пахі я ўсе ўспамінаю,
    І цешуся імі, як хлопец малы,
    І чуюся, быццам папаў я да раю,
    Дзе ззяе ўсё бляскам, не відна імглы.
Хачу тут забыць гарадскія матывы,
І пахі бензіну і дыму смурод,
Хачу наглядзецца на родныя нівы,
Прыпомніць хачу, як цвіце агарод.
    Каб потым зімою ў часы непагоды
    Калі за акном будзе вецер гудзець,
    Я б мог адчуваць усе пахі прыроды,
    Не думаць аб бачнай усюды бядзе.
Каб потым у цёплым пакоі зімою
Успомніць там родныя пахі здаля.
Як пахнуць прыемна палі тут вясною!
Як пахне тут родная наша зямля!

## ХВАРОБА ПАДЛЯШША

На Падляшшы пасялілі нашых продкаў,
Як была навокал пушча без людзей,
Як гразілі ім звяры, ад рэк паводкі,
А на полі збожжа не расло нідзе.
    Балоты сушылі, карчавалі дрэвы,
    Ставілі зямлянкі , а пасля дамы,
    Разрыхлялі поле пад свае пасевы,
    Рыхтавалі дровы на прыход зімы.
Паўставалі вёскі, а пасля і замкі,
І раслі пры замках часта гарады,
А прыходзіў вораг з кожнага напрамку,
І ім астаўляў крывавыя сляды.
    І прышэльцы з дзіўнай глыбіні стагоддзяў,
    З нашай беднай і прадзедавай зямлі,
    Новы беларускі наш народ народзяць,
    Мы яго нашчадкі тут на свет прыйшлі.
Праз вякі народ наш тут трымаўся разам,
Захаваў ён веру з моваю сваёй,
Пераўжыў ён войны, здзекі і абразы,
І не расставаўся з роднаю зямлёй.
    Бежанства яго загнала на чужыну,
    Ды пасля вярнуўся з цяжкасцю назад,
    І вось працярпеўшы не адну айчыну,
    У нашчадкаў бачым дзіўны заняпад.
Сорам чуе ён цяпер да роднай мовы,
Моваю чужой гаворыць да дзяцей,
Хоць калечыць часта ён чужыя словы,
Удае чужынца між сваіх людзей.
    Дзеці іх пачулі сорам да народу,
    Да сваіх бацькоў і да сваіх дзядоў,
    Каб не знаць свайго ні племені ні роду,
    Уцяклі яны ў абдымкі гарадоў.
Там адны, як праваслаўныя палякі,
Ходзяць рэдка ў праваслаўную царкву,
А зноў з сораму другія небаракі
У касцёлы завялі сваю дзятву.

Раствараецца ён у другім народзе
Рэдка ходзіць ён на могілкі бацькоў,
І здаецца, што ён праз адно стагоддзе
Быццам цень загіне ў моры чужакоў.

KAMUNIKAT.org

## БЕРЛІНСКАЯ СЦЯНА

Паміж дамоў праз трыццаць год
Стаяла ў горадзе Берліне
Сцяна, на ёй калючы дрот
Блішчэў як нож на гіляціне.
    Там мураваная сцяна
    Цягнулася на кіламетры,
    І ўдзень, і ноччу давідна
    Там чуўся стогн глухі ў паветры.
То вецер плакаў ля сцяны,
Не мог прабіцца цераз муры,
Чапляўся дроту, як струны,
З яго выходзіў гук пануры.
    Сачылі за сцяной заўжды
    Тупыя вочы паліцаяў,
    Каб не з’явілася сюды
    Асоба смелая жывая.
Каб не пралезла праз сцяну
Яна на старану  другую,
Бо за сцяну нельга зірнуць,
Пазнаць, што людзі за ёй чуюць.
    Аднак знайшліся смельчакі,
    Што праз сцяну прайшлі, як цені,
    Хаця адборныя стралкі
    Стралялі ў іх як у мішэні.
Аж рушыў да сцяны народ,
І разабраў яе на часткі,
Зрабіў да вольнасці праход,
І выйшаў сам з закрытай пасткі.
    Ці цешацца цяпер яны
    Свабодай і здароўем?
    Бо хоць няма ўжо ў іх сцяны,
    То маюць беспрацоўе.

## ПОЎНЯ МЕСЯЦА

Месяц, як ліхтар ці пластыр круглы мёду
Ззяе золатам высока над зямлёю,
А рой зорак, быццам пчолы з агароду,
Над ім кружацца вялікаю сям'ёю.
А спадаючыя зоркі - мёду каплі,
На зямлю ўвесь час сплываюць ручаямі,
Патакай ляцяць у воду, быццам чаплі,
Свецяць промнямі яскрава над палямі.
Буду помніць поўню месяца на фронце,
Як сядзеў я дзесь на вышках з кулямётам,
Месяц ззяў тады на небе, быццам сонца,
А рой зорак з ім жаўцеў, як воск у сотах.
А снег ясны на палях мігаў ад зорак,
Ад ракет і ад трасіруючых куляў,
З вышак зорка я глядзеў на белы ўзгорак,
Ці варожая не з'явіцца кашуля.
Цэлу ноч я пільнаваў узгорак гэты,
Поўня месяца мне ў тым дапамагала,
Хоць лятали каляровыя ракеты,
Для мяне на вышках ноч прабегла ўдала.
А другую поўню помню я ў акопах,
Як мы скуленыя ноччу ў іх ляжалі,
Бо тады, хто быў адважным асталопам,
То яго ў магілу хутка забіралі,
Мы галоў там не высоўвалі з траншэі,
Вораг бачыў нас здалёку з дзотаў, дотаў,
Мінамётныя гудзелі батарэі,
Сотні куль свісцелі зверху з кулямётаў.

# НА ЗЛОБУ ДНЯ

## УСЯВЫШНІ ДАЎ НАМ

Усявышні даў нам не найгоршы лёс,
Мы не галадаем, так як афрыканцы,
І зімой не мерзнем, так як эскімос,
І вайны не бачым блізка, як афганцы.
Хоць відаць між намі многа беднякоў,
І бяздомных процьма ў гарадах усюды,
Ды штодзень улада не шкадуе слоў:
Цешыць нас надзеяй, што лепш заўтра будзе.
Цешыць нас, што будзе будаваць дамы,
Прыбаўляць штогод для нас усіх заробкі,
А зладзеяў хутка ўсадзіць да турмы,
Беспрацоўе згіне цераз час кароткі.
Тры мільёны новых людзям дасць кватэр
Толькі за год восем новай іх улады,
І дастане моладзь стымул да кар’ер,
Зменяцца дарогі ўсе на аўтастрады.
Хваляцца, крычаць без сораму яны,
Што чацьвёртую рэспубліку ствараюць,
Зробляць людзям рай, а толькі ў кайданы
Закуюць бандытаў і зладзеяў зграю.
І куюць жалеза ўлады кавалі,
Пасварыўшы беларусаў напачатку,
Бо датацыю няпэўным аднялі,
Каб аб’едкі даць другім усухамятку.
І наіўных многа ў нас жыве людзей,
Што паверaць хутка розным дэмагогам,
І прагаласуюць на іх, ды ў бядзе
Самі будуць жыць далей аж да знямогі.
Усявышні даў нам не найгоршы лёс,
Мы Яму ўсе вельмі дзякуем за гэта,
Што на хлеб хапае і на абрыкос,
Што на водку часам знойдзецца манета.

І што ўлада скажа, то для нас канон,
Добрыя для нас яе ўсе аргументы,
Як яна і і дур заменіць у закон,
Ёй даём дзяцей  на ўсе эксперыменты.
    Вышле іх тады ў Ірак, Аўганістан,
    Як захоча толькі пан з-за акіяна,
    Будуць пільнаваць там бедных мусульман,
    Там дзе льецца кроў, страляюць несціхана.
Моладзь штораз больш бяжыць дзесь за кардон,
Частка астаецца жыць там пастаянна,
За год уцякло іх  не адзін мільён.
Верыць перастала ўлады  абяцанням.

KAMUNIKAT.org

## ЯКІ СТАЎ СТРАШНЫ ГЭТЫ СВЕТ

Які стаў страшны гэты свет,
Адны ў ім бявяцца, смяюцца,
Другім глядзіць у вочы смерць,
А трэція з маркоты б'юцца.
    Адны будуюць гарады,
    Другія бомбамі іх нішчаць,
    Туды салдат шлюць маладых,
    Каб з іх зрабілі папялішча.
Адны выхоўваюць дзяцей,
Другія ў іх з гармат страляюць,
І не баяцца, што пазней
Іх душы не пабачаць раю.
    Адны не знаюць, што зрабіць
    З награбленым чужым багаццем,
    Другіх зноў б'е галечы біч,
    Праследуе жыццё няшчасце.
Адны ў палацах п'юць кагор,
Не знаюць голаду ні страху,
Другія гінуць за тэрор,
З шалёным крыкам: за Алаха!
    На свеце тысячы людзей,
    Як мухі ў шэрай павуціне,
    З гуртом жанчын, малых дзяцей,
    Штодзень ад помсты недзе гіне.
Які стаў страшны гэты свет,
І застанецца ён нікчэмным.
Ісус Хрыстос і Магамет
Памерлі за яго дарэмна.
    Ніхто не слухае іх слоў,
    А рэлігійная нянавісць
    П'е, быццам цмок, людскую кроў,
    Забойства і злачынства славіць.

## БЕЗРАЗВАЖНАЯ НЯНАВІСЦЬ

Безразважная нянавісць нішчыць часта
Ненавіснікаў самых і іх народ,
Як пад'юдзіць да паўстання ўлады каста,
І пашле іх на мацнейшага ў паход.
        Так было калісь з народам Аўраама,
        Як Бар-Кохба на рымлянаў іх пагнаў,
        Іх паўстанне для народу стала драмай,
        Рымскі кесар іх па свеце разагнаў.
Занялі пасля арабы Палесціну.
На зямлі, дзе прапаведваў сам Хрыстос
З мінарэтаў верашчалі муэдзіны,
Голас іх далёка ў неба вецер нёс.
        Гэта хвалявала вельмі рымскіх папаў,
        У якіх з нянавісці кіпела кроў,
        І яны ў той час, як жорсткія сатрапы,
        Высылалі ў Палясціну крыжакоў.
Разбуралі ўсе крыжацкія паходы
Візантыйскія палі і гарады.
Гінулі малыя бедныя народы,
Там дзе крыжаносцы ставілі сляды.
        Папская нянавісць прынясла Еўропе
        Небяспеку янычараў, мусульман,
        І дайшлі яны далёка пад Радопы,
        Вену ледзь не ўзяў турэцкі Сулейман.
А калі ізноў патомкі Аўраама,
З дапамогаю заакіянскіх сіл,
Захапілі землі блізка Іардана
Загрымеў арабскі цэлы небасхіл.
        І больш чым паўвека не дайдуць да згоды,
        З іх ніхто не хоча слухаць мірных слоў,
        Б'юцца між сабой семіцкія народы,
        Льецца безупынна там навокал кроў.
Безразважная нянавісць у арабаў
Ім штогод прыносіць тысячы ахвяр,
Гінуць дзеці, хлопцы ад куль і снарадаў,
Гарады іх нішчаць бомбы і пажар.

Атакуюць часта, як мухі карову,
З захаду Хамас, з Лівана Хезбалах,
Вораг нішчыць іх паволі паступова,
Іх жанчыны, дзеці бачаць смерць і жах.
Вораг іх магутны мае самалёты,
Многа верталётаў, танкаў і гармат,
А яны з ,,кацюш”  страляюць з цёмных гротаў,
І для абароны носяць аўтамат.
Тыгра палкаю ніхто не пераможа,
А бязглуздая з Ізраілям вайна
Прынясці арабам радасці не можа,
Смерць, параза іх чакае не адна.
А не лепш было б з жыдамі жыць у згодзе,
Мець зямлі кавалак вольнай і сваёй,
І не сеяць больш нянавісці ў народзе,
Багацець і бачыць шчасце і спакой.

KAMUNIKAT.org

# У ЧАТЫРОХ СЦЕНАХ

Хоць не адна вакол мяне сцяна,
То бачу ўсё, што дзеецца на свеце,
На ўсходзе відна, як ідзе вайна,
Як гінуць там ад куль жанчыны, дзеці.

Яшчэ не нішчаць нашых гарадоў
Агонь і бомбы, кулі і снарады,
Аднак, як дзесь нявінных льецца кроў,
Не можа быць іх ворагам спагады.

Хоць фронт баёў яшчэ не страшыць нас,
Усё ж такі баімся тэрарыстаў,
Гатовымі быць трэба кожны час
На выбрыкі шалёных ісламістаў.

Не трэба з іх было на нас ствараць
Калісь варожай помсты  адрасантаў,
Туды салдатаў нашых пасылаць
Для дапамогі іхнім акупантам.

Салдаты нашы гінуць у баях
За норавы чужыя за марамі,
А мучыць нас усіх бяда свая,
І барамся мы з ёю толькі самі.

Турботы маем мы з чужой вайны,
І з-за яе гразіць нам небяспека,
Нас страшыць тэрарызм з чужой віны
Страх, недаверлівасць да чалавека.

А вінаватыя тут нашы важакі,
Якія толькі для сваёй кар'еры,
Салдатаў выслалі ў пустынныя пяскі,
Каб біліся яны за мільянераў.

## ЛЮБОЎ ДА ЛЮДЗЕЙ

Даўно любоў забілі людзі
Да іншых блізкіх ім людзей,
Нянавісць ім у сэрцах будзіць
Жаданне помсты, як у змей.
        Адны другім ствараюць крыўды,
        Абкрадваюць у белы дзень,
        Наносяць раны і абіды,
        І іх праследуюць, як цень.
Зайздросцяць поспехаў знаёмым,
Паціху ігнаруюць іх.
Паклёпы страшныя да стомы
Ствараюць на сяброў сваіх.
        А як захопіць хтось ўладу,
        То каб яе не страціць з рук,
        Шукаць навокал будзе здраду,
        Ці спакушаць, як злы кадук.
Праціўнікаў захоча знішчыць,
Ці закаваць у кайданы,
З дамоў іх зробіць папялішча,
Калі дзесь дойдзе да вайны.
        Найгоршыя з іх - тэрарысты,
        Якія для сваіх ідэй,
        Як выраджэнскія садысты,
        Вядуць на смерць жанчын, дзяцей.
Падкладваюць без жалю міны
У самалётах, цягніках,
І ад таго, што людзі згінуць
Не задрыжыць у іх рука.
        Зноў самагубцы пад'язджаюць
        З паклажай бомб на сам базар,
        Яны з ім разам выбухаюць,.
        Прыносяць раны, смерць, пажар.
Ідэя помсты, як наркотык
Вайшла ў людскія сэрцы, кроў,
І праз шырокія вароты
Пакінула людзей любоў.

## ПЕРАМЕНЫ

Збылося многа дзіўных перамен
Падчас майго жыцця ў краіне нашай,
Адны прайшлі, бы ў летнім сонцы, цень,
Другія сёння ва ўспамінах страшаць.
　　За гэты час змяніўся ўвесь народ,
　　Стаў недаверлівым, аднак наіўным.
　　Хто зверху быў, цяпер упаў на спод,
　　За прошлае яго зрабілі вінным.
Інакш цяпер ацэньваюць людзей,
З былых бандытаў робяць патрыётаў,
Інакш падходзяць да старых падзей,
Салдат берлінгаўцаў абкідваюць балотам.
　　З былою ўладай многа змагароў
　　Пачулася ў парламенце пасламі,
　　І розных масцей дзікіх гандляроў
　　Зрабілі бізнесменамі, купцамі.
Без сораму з іх многія крадуць,
Жывуць на шыі беднага народа,
Забылі ўсе пра голад, пра бяду,
Людзей узнікла новая парода.
　　І многа дрэні лезе кожны раз,
　　Каб кандыдатам быць у прэзідэнты,
　　Каб іх з афішы бачылі абраз,
　　І каб віталі іх апладысменты.
Іх не цікавіць, што бяздомны люд
Ад холаду зімою замярзае,
І што ў бальніцах ёсць навокал бруд,
Што беспрацоўны штодзень галадае.
　　Далі свабоду ад бясплатных школ,
　　Далі свабоду нам усім ад працы,
　　Спаць пад мастом не трэба мець дазвол,
　　Хто мае грошы, выспіцца ў палацы.
Такія з камунізмам змагары
Сядзяць цяпер на ўлады крэслах,
Кроў бедных ссуць, як летам камары,
І цешацца, што ўжо „камуна” счэзла.

# НАІЎНЫЯ

Наіўныя вераць, што свет добры будзе,
Што зменяцца людзі і з часам зло згіне.
Не знаюць яны ўсіх безлітасных дзеяў,
Якія з антычных дайшлі эпапеяў,
Што ў свеце заўсёды нікчэмныя людзі
Жылі і жыць будуць у кожнай краіне.
        Іх вабяць хлуснёю палітыкі нашы,
        Наіўныя вераць далей дэмагогам,
        Якія маняць іх і ім абяцаюць,
        Што будуць пры ўладзе іх жыць, як у раю,
        Мець хлеб, многа грошаў, віна поўна ў чашы.
        Як выбяруць іх, тады скардзяцца Богу.
Пужаюць іх войны і ўсе тэрарысты,
Баяцца, каб тут не грымелі гарматы,
Аднак, як вайна пачалася за морам,
Яны памірыліся з весткаю скора,
І вераць ілжывым славам аферыстаў,
Што нішчаць там толькі адных вінаватых.
        Ману і хлусню іх  прымаюць без бунту,
        Бо слухаюць з верай ксяндзоў ў касцёле,
        Што трэба цярпець тут для божага царства.
        Калі на сабе іх пачуюць махлярства,
        То выкажуць толькі свае ў тым бязволле,
        Як бы пад нагамі не чулі ўжо грунту.
Наіўных напэўна ніхто ў нас не сее,
Яны самі родзяцца ў цяжкіх умовах,
Прыносяць яны кожнай ўладзе карысці.
Калі ж стане менш іх быць можа калісьці,
Тады ўлады будуць лічыцца са словам,
Не будуць маною, як ветрам, нам веяць.

## ТАК МНОГА НАВАКОЛ МАНЫ

Так многа навакол маны,
Што ўсе жывем з ёй, як з пейзажам.
Тут нашай многа ёсць віны,
Бо нас мана не бударажыць.
І на базарах і ў ларках,
Нас хочуць ашукаць яхідна,
Там часта спрытная рука
Абкрасці можа нас агідна,
І мы прывыклі да ўсяго,
Хвалюемся,  ды вельмі рэдка,
Не любім толкі аднаго,
Як нам віну дакажа сведка.
Рэкламы нам хлусяць штодзень,
А на экране пагадзінна,
Маны палітыкаў, як цень,
За намі ходзяць безупынна.
Палітыкі найбольш ілгуць:
Прад выбарамі абяцаюць,
Што як уладу ім дадуць,
То будзем жыць, як Ева ў раю.
А потым праўда з іхніх слоў,
Іх не цікавіць, не ўзбуджае,
Іх не хвалюе, што зімой
Бядняк ад холаду ўмірае,
Яны ілгалі, каб з казны,
Маглі найбольш награбіць грошай.
У іх няма чуцця віны,
Калі жывуць з маны ў раскошы.

# ТУРБОТЫ МАЛАДАЖОНАЎ

Многа турбот пражылі перад шлюбам:
Вэлюм - паненцы, касцюм - маладому,
Тэрмін - у бацюшкі, тэрмін – у клубе,
Родных паклікалі, мноства знаёмых.
Ежы вагон прыгатовілі з водкай,
Лыжкі, відэльцы, нажы і талеркі,
Фуру напіткаў і тортаў салодкіх,
Сотню кілішкаў да моцнай гарэлкі.
Цэлую ноч весяліліся госці,
Граў ім аркестр, танцавалі, спявалі,
Як закрычаў маладым ,,горка!” хтосьці,
Маладажоны сябе цалавалі.
Толькі ўдзень белы ў абдымках у стомы
На адпачынак пайшлі, як да раю.
Потайкам ён, не сказаўшы нікому,
Просціны з памяткай недзе схавае.
Верылі цвёрда яны ў лёс свой мілы,
Вельмі кахаюцца, маюць надзею,
Што ім пасля хопіць волі і сілы
Перамагчы перашкоды падзеяў.
І аддалі ўжо часткова пазыкі,
Ціха лічылі даўгі і пакункі,
І ўспаміналі гасцей ўсіх, іх крыкі,
Як уручалі яны падарункі.
Кветак вазоны стаяць у пакоях,
Вянуць яны, выкідаць хутка трэба,
Мусяць прыбраць, не хапае настрою,
Нават для ежы няма ўжо ў іх хлеба.
Шлюб перабег, быццам сон цёмнай ноччу,
Вабяць цяпер іх чароўныя мроі,
Час толькі мае смяшлівыя вочы,
Кпіць з іх кахання, надзей і спакою.

## УТАПІСТАМ

Калі б вы жылі дзесь на іншай планеце,
Я мог бы паверыць, што створыце рай,
Што вольнымі будзеце вы, вашы дзеці,
І вы не пачуеце слова: гультай.
        Магла б быць у вас там сумленная ўлада,
        Якая бы дбала аб вас увесь час,
        І мела да бедных і хворых спагаду,
        Ніколі не крала, не мучыла вас.
Не клікала б вас, каб ісці ў бой на войны,
І не прызывала б на службу салдат,
Разбою б не зналі ў краіне спакойнай,
Не чулі б там выбухаў бомб ці гранат.
        Не страшылі б вас паліцэйскія боты,
        Сумленна  плацілі б вы вашы даўгі,
        Улады б для вас не рабілі турботы,
        І не ап’янялі б маной вам мазгі.
А вы жывяце тут у нашай краіне,
Дзе хабар, зладзейства пануе даўно,
Дзе бачым галечу мы ў кожнай мясціне,
А ўлады карупцыя сходзіць на дно.
        Дзе ўлада ўся стала адным дэмагогам,
        Вас маніць і цешыць шчаслівым жыццём,
        Пужае вас пеклам, і д’яблам і Богам,
        Турмою і штрафам, а нават біццём.
Нацкоўвае вас на людзей невядомых,
І іх вінаваціць у вашай бядзе,
І ворагаў творыць між вамі свядома,
Каб вы не шукалі больш праўды нідзе.
        І сее яна фанатызм і нянавісць,
        Таксама варожасць да іншых дзяржаў,
        Калішніх бандытаў, фанатыкаў славіць,
        Яе прапагандай кіруе ілжа.
Не веру, што прыйдзе да вас справядлівасць,
Што кожнага стане ахоўваць закон,
Што будзеце жыць у краіне шчаслівай,
Што моладзь не будзе ўцякаць за кардон.

## КАЛІ Б ДА НАС ПРЫЙШОЎ ХРЫСТОС

Калі б да нас прыйшоў Хрыстос,
І прапаведваў, як калісьці,
Яго спаткаў бы цяжкі лёс,
Не меў бы Ён з людзей карысці.
　　Ён на крыжы бы не памёр,
　　Аднак Яго б тут абылгалі,
　　І не пусцілі б на свой двор
　　Праціўнікі Яго маралі.
Усе фанатыкі Яго,
Якія кленчаць у касцёлах,
Хрыста б укінулі ў агонь,
З Яго б смяяліся наўкола,
　　Калі б сказаў Ён толькі ім,
　　Што ў пекла пойдзе той, хто брата,
　　У гневе будучы прытым,
　　Пры іншых назаве вар'ятам.
Палітыкі ж навокал нас,
Яго б змяшалі ўсе з балотам,
Калі Ён даў бы ім наказ,
Жыць без маны, пазнаць галоту.
　　Не красці, не пужаць людзей,
　　Пакінуць лаянкі і звады,
　　І не кусаць другіх, як змей,
　　І не трымацца моцна ўлады.
Калі б цяпер прыйшоў Хрыстос,
Яго ў турму б дзесь пасадзілі,
Зімой бы выгналі ў мароз
На сцюжу, ці яго б забілі.

## ВІФЛІЕМ

Як напісаў калісь евангеліст Лука,
Радзіўся ў Віфліеме ў яслях Бог Хрыстос.
Калі Ён быў у гроце ў матчыных руках,
То пастухі прыйшлі туды яго шукаць,
Бо радасную вестку ім анёл прынёс.
Анёлы ім спявалі: мір на ўсёй зямлі,
Аб славе ў вышніх Богу,  ласцы для людзей.
Калі яны пачулі песні, то пайшлі
У Віфліем і ў яслях там Хрыста знайшлі,
І вестку аб падзеі панясслі далей.
Як напісаў калісь евангеліст Мацвей,
Што горад Віфліем сустрэў журботны лёс,
Цар іудзейскі Ірад – казачны кашчэй,
Там смерцю пакараў усіх малых дзяцей,
Бо думаў, што між імі згіне Бог Хрыстос.
І потым горад бачыў войны многа раз,
Ён сустракаў рымлянаў, персаў, крыжакоў,
Ад туркаў і арабаў чуў тысячы абраз,
Цярпеў ён ад пажараў і другіх зараз,
Нахабна ганьбілі ў ім храм, дзе быў Хрыстос,
А мінарэты там раслі, як на дрожджах,
Бо панавалі там галеча і хаос,
І хрысціяне там цярпелі цяжкі лёс,
Ды чулася наўкол аб іх адна ілжа.
Цяпер таксама там грыміць наўкол вайна,
Стракочуць кулямёты, гукі чуць гармат,
Пажары шугаюць начамі давідна,
Да танкаў дзеці там страляюць з-за акна.
Араб амаль што кожны мае аўтамат.
Дзесяткамі арабы гінуць кожны дзень,
Аднак нянавісць іх на смерць вядзе,
Яна пры кожным з іх стаіць заўжды, як цень,
І нішчыць іх, як сенажаць сухмень.
Ды відна ім жыццё немілае ў бядзе.

## СУМЛЕННАСЦЬ ПАЛІТЫКАЎ

Палітыкаў дзесяткі селі за сталамі,
Гавораць аб злачыннасці ў дзяржаве між людзей,
Яны грахоў злачынства многа маюць самі,
Ды аб іх нельга знаць нікому і нідзе.
Дзяржаўнай таямніцай сталі іх злачынствы,
Не можа аб іх ведаць нават пракурор,
А ў ворагаў сваіх шукаюць ці ў дзяцінстве
Іх нехта не ўцягнуў у кражу ці ў тэрор.
Шукаюць у праціўнікаў малой заганы,
Пасля, каб з ёй зрабіць судовы прыгавор,
Або нанесці ім глыбока ў сэрцы раны,
Каб не маглі аддаць віноўнікам адпор.
А многа з іх было замешаных у хабар,
Таму разбагацеўшы ў палітыку ўвайшлі,
А іншым зноў памог злачынны нейкі сябар,
Падкінуў іх уверх, яму каб памаглі.
А трэція зноў мелі з мафіяю здзелкі,
Ёй памаглі не раз наркотыкі прадаць,
Ці падрабляць таемна спірт, віно, гарэлку,
Або дзесь банкі, магазіны абкрадаць.
Гарбы грахоў хаваюцць у сталёвых скрынях,
І знае аб іх толькі некалькі асоб,
Сургуч на іх з пячаткай, цёмная цвярдыня,
Да іх не дабярэцца ні адзін мікроб.
Без сораму яны гавораць аб злачынствах
Праціўнікаў сваіх і праведных людзей,
Паклёп кідаць на ўсіх яднае іх адзінства,
І крык амаль адзін выходзіць з іх грудзей.

**ГРАХІ**

Як цені стаяць нам заўжды прад вачыма,
І вабяць раскошай нас нашы грахі,
Мы можа не знаем усіх іх магчыма,
І страх перад імі бывае глухі.
Не чуем яго, а як чуем, то слаба:
Галодны, не верыць у грэх за крадзеж,
Жанчына грахом не прызнае прывабы,
Нявольнік грахом не абразіць мяцеж.
Хто з помсты дзесь скрыўдзіў, забіў чалавека,
То ўзяў на сумленне сваё цяжкі грэх,
Злачынцы раскошу знаходзяць у здзеках,
Людзей забіваюць. для ўласных уцех.
Хоць хцівасць збірання багацця ёсць грэхам,
Калі павялічвае лік беднякоў,
Аднак багацеі багацце з уцехай
Свае памнажалі праз сотні вякоў.
Яны не баяцца граху і пагарды,
Што ў пекла іх душы калісь пападуць,
Не мучыць іх сорам, што ўсюды мільярды
Галодных людзей просяць грош на яду.
Граху не баіцца ўладар што на войны
Салдат высылае, каб білі людзей,
І кажа страляць там з гармат дальнабойных,
І бомбы кідаць на жанчын і дзяцей.
Ці хто з нас сагрэшыць, калі ў абароне,
Заб’е свайго ворага ў час барацьбы?
Ці грэшыў калісьці кароль у кароне,
Як гінулі ў цырках ягоных рабы?
Ці грэшылі рымскія папы калісьці,
Калі пасылалі ў паход крыжакоў,
Каб білі, палілі для ўласнай карысці
Арабаў, літоўцаў, славян, прусакоў?
Ці грэшылі папа, яго езуіты,
Калі іншаверцаў палілі ў агні?
Ці грэшаць арабы шыіты, суніты,
Як храм мусульманскі ідуць бараніць?

Жрацы, духавенства супольна з уладай
Стварылі рэестры грахоў для людзей,
А самі на іх спаглядалі з пагардай,
І іх за табу не лічылі нідзе.

KAMUNIKAT.org

# ЗАХАПЛЕННІ

## РАДАСЦЬ ІНЖЫНЕРА-ПЕНСІЯНЕРА

На старасць лёс мне ўдзячны стаў,
Даўно я ўжо не галадаю,
Не маю безвыходных спраў,
Жыву ў дастатку, як у раю.
Пакуль здаровы я яшчэ,
Не часта мучаюць хваробы,
Не сніцца ноччу мне кашчэй,
Які прыходзіў бы з чашчобы.
Я не багаты і таму
Не апасаюся бандытаў,
У доме цёпла ўсю зіму,
Пры вокнах з кратамі адкрытых.
Удзень на шпацыр дзесь хаджу,
Блукаю часта я па парку,
Калі вярнуся пагляджу
У тэлевізар, вып’ю чарку.
Па грошы еду ў банкамат,
Бо ў банку пенсію трымаю,
Хоць грошаў маю там няшмат,
Ды на выдаткі ўсе хапае.
Магу паехаць раз у год
Я ў падарожжа за граніцу,
Пабачыць, як жыве народ
Дзесь у Парыжы ці Мадрыце.
Штомесяц пенсію маю
На мой рахунак прысылаюць.
З пасцелі ранкам я ўстаю,
Тады, калі сам пажадаю.
На гэты лёс я працаваў,
Як не гразіла беспрацоўе,
Я працы сорак год аддаў,
Не шкадаваў свайго здароўя,

Цяпер збіраю  ураджай,
Пакуль хапае сіл і волі,
Я цешуся, як той ратай,
Што заараў сваё ўсё поле.

І смутна мне глядзець цяпер
На беспрацоўных і бяздомных,
Бо інжынер-пенсіянер
Не мае іх турбот злапомных.

KAMUNIKAT.org

**МАЯ МАРА**

Мара мая, шукай прасторы,
Ляці далёка дзесь у свет,
Там дзе на небе свецяць зоры,
І даляці да іх планет.
    Мне пакажы, ці там ёсць людзі,
    Ці ёсць жыццё, ці мёртвы хлам,
    А можа там дзесь на бязлюдзі,
    Жыве ў рацэ гіпапатам.
Мара мая ляці над морам,
І паглядзі на караблі,
Ці іх матросы там бадзёра
Сустрэч чакаюць на зямлі.
    Ці заліваюць іх там хвалі,
    Ці іх не страшыць ураган,
    Ці ловяць там яны кефалі,
    Ці ў іх разумны капітан.
Мара мая ляці над горы,
Дзе на вяршынях відна снег,
Дзе альпіністы ад учора
Сысці не могуць на начлег.
    Бо снег завеяў ім дарогу,
    Да іх далёкага шатра,
    Па скалах пнуцца, просяць Бога,
    Каб зноў пагрэцца ля кастра.
Мара мая ляці ў пячоры,
Дзе ў цемры свецяць ліхтары,
Дзе людзі сходзяць у каморы
Па дне тунэля ўніз згары.
    Ці там, дзе толькі спелеолаг
    Можа спусціцца аж на дно,
    Шукаць у цемры, як біёлаг,
    На сценах сотні кажаноў.
Мара мая, ляці, як Фея,
І ўсё прадстаў мне наяву.
Толькі ў табе мая надзея,
Толькі з табою я жыву.

## НОВЫ РАНАК У СЯЛЕ

Вось з чэрава бязлюднай ночы
Радзіўся ціха светлы дзень,
Расой абмыўшы сонца вочы,
Пусціла ў змрок святла струмень,
Загаслі зоркі ўсе высока,
Закрыў блакітны іх вуаль,
На лузе кветкі цешаць вока,
З травой зялёнаю, як шаль.
Імгла ўцякла за лес хваёвы,
Блішчыць янтарамі раса,
Чуць моцны вецер з-за дубровы,
Гудзе, як шэршань, ці аса.
І заспявалі раптам птушкі,
Найгаласней з іх салавей,
Іх вельмі раннія частушкі
Са сну збудзілі ўжо людзей.
Ідуць каровы дзесь на пашу,
А ззаду гоніць іх пастух,
З сабой нясе ён хлеб і кашу,
Схаваўшы з торбай пад фартух.
Блукаюць блізка хат сяляне,
Пішчаць дзесь свінні ў катуху,
Навокал гусі грубіяняць,
Крычаць не знаючы граху.
Шар сонца пнецца да зеніту
І ў небе ззяе ўсё ярчэй,
І з-пад нябеснага блакіту
Да школы будзіць ён дзяцей.

## ДВА КАТЫ

За акном куражыцца
Чэрвень залаты,
А на даху смажацца
Ціха два каты.
Моцна прытуліліся
Да сухой страхі,
Як у цела ўпіліся
Недзе дзве блыхі.
Ад жары тут плавяцца
Вострым стаў іх слых,
Сочаць ці не з'явяцца
Птушкі блізка іх.
Вераб'і разумныя
Дражняць іх здалёк,
І каты два сумныя
Мучаць толькі зрок.
Побач бэз з рабінаю
На катоў глядзіць,
Трэллю салаўінаю
Неба ўсё звініць.
Ветрык цёплы блукае
І нясе іх спеў,
Часам ён застукае
Аб галінкі дрэў.
Ды каты, як мёртвыя,
На страсе ляжаць,
Толькі вочы вострыя
З лютасці дрыжаць.
Кветкі маляўнічыя -
Від для іх пусты.
Мэты паляўнічыя -
Гэта іх інстынкт.

## МЕТЭОР

Нябеснае цела блукала ў прасторы
Праз сотні мільёнаў гадоў на зямлі,
Плыло ў пустаце, як байдарка па моры
Там дзе не званлі дарог караблі.
І бачыла сонцы здалёк і планеты,
Якія плылі па арбітах сваіх,
Спаткала не раз па дарозе каметы
З хвастамі малюсак, з вачыма ваўчых.
Калісь ад каметы яго адарвала
Магутная сіла вялікіх планет,
Арбіту другую яму паказала,
Само, каб пабачыла дзіўны сусвет.
І вось з той пары ўжо па іншай дарозе
Само акружае ўнутры Млечны Шлях,
І мерзне ўвесь час на касмічным марозе,
Не знае здранцвелае, што гэта страх.
Ды раптам спаткала яно на арбіце
Малую зямлю нашу ў цёмную ноч,
Пачуўшы ў паветры сябе, як у сіце,
Рванулася ў бок, каб прабегчы наўзбоч.
Аднак прыцяжэнне зямное, як пашча,
Зассала ў сябе яго, быццам віхор,
Як звер, захацела яго з’есці нашча.
Яно загарэлася, як метэор.
Ад трэння з паветрам, як факел гарэла,
І іскры бліскалі на ўвесь небасхіл.
І з неба на землю, як зорка, ляцела
Нябеснае цела змяняўшыся ў пыл.
Мы бачым на небе, як падаюць зоркі,
А гэта нябесныя целы гарацъ,
А часам, як пісьмы з сусвета, асколкі,
Прышле нам здалёку нябесная знаць.
Вось так чалавек, як нябеснае цела,
Спакойна жыве без турбот і прыгод,
Пакуль дзесь няшчасце, што прыйдзе ў дзень белы,
Яго не заб’е, як чужы самаход.

## ЮНАЦТВАМ ЗЗЯЛА РАННЯЯ ЗАРА

Юнацтвам ззяла ранняя зара,
З усходу асвятляла дом і агароды,
І ў промнях золата і ў бляску серабра
Смяяцца стала ў наваколлі ўся прырода.
　　Дыхала зелень сакавітасцю лістоў
　　На дрэвах, на палях і на лугах шырокіх,
　　Лятали птушкі, шчабяталі між кустоў,
　　Вароны каркалі і бегалі сарокі.
Трава яшчэ была пакрытая расой,
Яна іскрылася брыльянтамі навокал,
Манілі кветкі чарадзейскаю красой,
Высока ў небе праляцеў драпежны сокал.
　　Я выйшаў, каб паветрам свежым падыхаць,
　　І каб пабачыць круг рубінавага сонца,
　　Паслухаць песні маладога пастуха,
　　Які спяваў паміж кароў сваіх бясконца.
Цяпер тут захапляў мяне духмяны сад,
Які бялеў ад свежых, як сняжынкі, кветак,
І радаваў мяне цвітучы вінаград,
За ім іскрысты ад расы аўса палетак.
　　Нясу я ў жмені невядомы мне мой лёс,
　　Які запісаны тут на маёй далоні,
　　І цешуся, што ён сюды мяне прынёс,
　　Што я купаюся ў зары чароўнай тоні.
Што я магу забыць тут горычы жыцця,
Прыпомніць толькі мілыя ў ім эпізоды,
І палюбіць сусвет, як маткаю дзіця,
Зачараваны прыгажосцю ўсёй прыроды

## ДАСКАНАЛАСЦЬ

Імкнуцца людзі ўбачыць дасканаласць,
Яна аднак скрываецца ад іх,
Для мастака ёсць важная трываласць,
Каб вечна заварожвала б усіх.
Прыгожыя малююць краявіды,
Якія ім фантазія дае,
Будуюць ля калон карыятыды,
І выдумкі чароўныя свае.
А часта захапляюць іх жанчыны,
Цудоўныя багіні з пены хваль,
Іх вусны чырванеюць, як маліны,
Сукенкі іх бялеюць, як вуаль.
І ўсё, што ім здаецца дасканалым,
Сяброў не захапляе, так як іх,
А нават бачаць творчасць іх няўдалай,
Якая ёсць прыемнай для другіх.
Хоць творцы ўсе спяшаюцца да мэты,
Каб дасканаласць людзям паказаць,
Яна блішчыць далёка, як планеты,
Якія з неба на Зямлю глядзяць.
Амаль заўсёды будзе дасканалым
Для маткі ўласнае яе дзіцё,
Для той яе каштоўнасці трывалай
Гатовая аддаць сваё жыццё.
Ды варвара не цешыць дасканаласць,
Кідае бомбы зверху на яе,
Без жалю ён штыком, або кінжалам
Дзіця чужое з радасцю заб'е.
Хоць уявіць нам цяжка дасканаласць,
Імкнуцца трэба, каб яе стварыць,
І можа створым нешта мы на хвалу,
І праз вякі яно дзесь будзе жыць.

## МУЗЫКА ПРЫРОДЫ

Не любіць прырода маўчання глухога,
Не хоча цярпець безгалоснай нуды,
Прыродная  музыка, быццам ад Бога,
Плыве безупынна з нябёсаў сюды.
Даходзяць да нас гукі сонца і зорак,
Зліваюцца з музыкай ветру і хмар,
Іграе для нас кожны лес і пагорак
Чароўнымі гукамі лір і гітар.
Жывем мы ў той музыцы, з ёю начуем,
І з ёю прыдзецца ўвесь шлях наш прайсці,
І хто не глухі, тую музыку чуе,
Прыносіць яна асалоду ў жыцці.
Калі нават ноч нас загоніць у хату,
Не ціхі дождж чуем за нашым акном,
То сыплюцца з неба брылянтаў караты,
То музыкі гукі ўваходзяць у дом.
І толькі глухія не чуюць тых гукаў,
І слухаюць радыё ці грамафон,
Або захапляюцца тактамі стукаў,
Якія дае барабан, ксілафон.
Адны авангардную музыку любяць,
Другіх цешыць  душу сам рок альбо джаз,
Перкусію трэція вельмі галубяць,
І глухнуць яны ад яе на паказ.
А мы не аглухнем ад музыкі света,
Таму трэба часта нам слухаць яе,
І можа пачуем яго запаветы
Куды кіраваць тут жыццё нам свае.

## ГІМН ЭЛЕКТРОНАМ

Нейтроны, пратоны – то атама часткі.
З зарадам адмоўным між іх - электроны,
Выходзяць знутры яго, быццам бы з пасткі.
Адзінку зарадаў назвалі кулонам.
Калісь электроны ўсе з маланак знalі,
Як беглі агністымі стрэламі з хмары,
І чулі іх выбухі, быццм стралялі
З гармат, як гудзелі мацней чым фанфары.
Іх бачылі ў іскрах у футрах і ў сталі,
Іх чулі ў бурштынах, цягнуўшых паперу,
Іх чулі дзяўчыны, што носяць каралі.
Кулон на секунду назвалі амперам.
Хоць бачылі з’яву, не знали прычыны,
Ніхто электронаў вачамі не бачыў,
Ды розум людскі навуковай сцяжынай,
Знайшоў электроны, іх змусіў да працы.
І ток электрычны круціць стаў маторы,
Якія цягнулі па рэйках вагоны,
І слаць правадамі з далёкай прасторы
Сігналы і весткі ва ўсе тэлефоны.
Людскі мозг знайшоў электронныя лямпы
Якія ўзмацнялі ўсе радыёхвалі,
Пачулі іх нават матросы на трампах,
Якія па моры далёка блукалі.
Пасля ў тэлевізар запрог электроны,
Каб нам паказалі на срэбным экране,
Усё што тварыцца на свеце шалёным,
Калі мы сядзім у сябе на тапчане.
Кампютэры змусілі зноў электроны
Рашаць вельмі цяжкія нашы задачы,
Прыймаць інтэрнет і, як паштальёны,
Разносіць нам пісьмы ў Нью-Йорк ці ў Карачы.
Ствараюць яны электрычныя дугі,
Святло электрычнае дома, ў палацы,
Для нас электроны, як дэманы-слугі,
Штодзень памагаюць і ў хаце, і ў працы.

## РАЗНАРОДНАСЦЬ ЛЕСУ

Густы лес мы бачым вясенняй парою,
Які ўжо ажыў па зімовых марозах,
Зямля зарасла маладою травою,
Лісцё зелянее на белых бярозах.
У лесе мы бачым тут розныя дрэвы.
Высокія стройныя пнуцца да неба,
З каронамі пекнымі, як каралевы,
І іх каранямі любуецца глеба.
А побач пузатыя, тоўстыя, кволыя,
Іх сонечны промень пагладзіць тут рэдка,
Галіны з лістотай іх сумныя, вялыя,
Жалліва на іх пазірае суседка.
Бярозы глядзяць,як дзяўчыны-красуні,
Іх шэлестам лісці смяюцца гулліва,
За імі дзве елкі стаяць прыгажуні,
Прымаюць іх гоман яны пагардліва.
Старая сасна ўжо з гарбом пры галінах
Пакорна зайздросціць прыгожым бярозам,
А шэрая з гладкай карою асіна
Абмервае зрокам усіх з важнай позай.
Яны пазіраюць усе ўверх на сонца,
Ці там не пакажуцца чорныя хмары,
Ці сонца свяціць ім тут будзе бясконца,
Ці неба ім дожджык прыемны падарыць.
У лесе бываюць усякія дрэвы,
Таксама, як розных людзей спатыкаем,
Як чуем над лесам мы розныя спевы...
Прырода заўжды разнароднасць кахае.

## ЛЕСВІЦА

Калі вертыкальна мы лесвіцу ставім,
То хочам падняцца мы ёю наверх,
Каб чуцца вышэйшым між розных абставін,
Ці дзесь заглянуць на якісьці паверх.
Мы ў думках хацелі б забрацца пад неба,
І там дакрануцца рукамі да хмар,
Такая прыходзіць часамі патрэба,
Што хочацца страціць зямны свой цяжар.
Што хочацца лётаць, як птушка ў паветры,
І зверху глядзець на зямны краявід,
Праходзіць праз буры, быць лёгкім на ветры,
Мець казачны дзіўны чароўны прывід.
Ці дзесь, як у Біблііі Якаў, пабачыць
Анёлаў, як сходзяць па лесвіцы ўніз,
І Бога на лесвіцы ў зорках гарачых,
Каб бліскалі з твару Яго прамяні.
Бо лесвіца – гэта дарога да зорак,
Скарочаная, каб да іх не дайсці,
Мы можам на ёй узабрацца на ўзгорак,
На дрэва высокае дзесь узысці.
Пажарнік на ёй узыходзіць высока,
Як мае на восьмым паверсе пажар,
З яе вадзяным залівае патокам
Агонь, дым у вокнах, рой іскраў і жар.
Калісь сотні лесвіц вазілі татары
З намерам асады сцяны крапасной,
Па лесвіцах лезлі яны ўверх, як хмары,
І тысячы гінула іх пад сцяной.
Прыступкі на лесвіцы бачым, як ноты,
Ад іх чуем музыкі гамы ў вушах.
Стварыў чалавек ужо лесвіцы ў гротах,
Калі ён пачуў, што ў яго ёсць душа.
Пасля стала лесвіца знакам кар’еры,
Прыступка наверсе была ў караля,
Цяпер захапілі яе ў нас прэм’еры,
Калі прэзідэнт не сядзіць ля руля.

## БАБІНА ЛЕТА ЎЦЯКЛО

Ды няма ўжо бабінага лета,
Страціла сярэбраны свой бляск,
Згінулі на дрэвах эпалеты,
З павуціных нітак, як атлас.
Каламутныя навокал фарбы
Прадракаюць восень і зіму,
Вецер за акном разносіць жальбы,
Быццам гоняць дзесь яго ў турму.
Сонца закрываюць часта хмары,
Дзе-нідзе ўжо сыплецца з іх град,
З бліскавіц гудзяць грамы – фанфары,
Быццам клічуць з неба на парад.
Дрэвы ўсе галінамі махаюць,
Шалясціць зялёнае лісцё,
Вецер урываецца да гаю,
Нават чуць і там яго выццё.
Час далёкі бабінага лета
Помню я, пачатак быў вайны,
Як дрыжала нашая планета
Ад гармат, ад бомб і ад маны.
Як гудзелі танкі на дарогах,
Як салдаты гінулі ад куль,
Як чакалі людзі дапамогі,
А яе не мелі ніадкуль.
Верасень быў сонечны, без слоты,
Неба сіняе было без хмар,
Часта ў ім гудзелі самалёты,
І спадаў смяротны з іх цяжар.
Бабінага лета не цярпелі
Людзі ў гэты вельмі грозны час,
Бо на небе вораг бачыў цэлі,
І ў іх мог паслаць боезапас.

## ЯНТАРНАЯ ВОСЕНЬ

Урываецца восень янтарнай лістотай
На кусты і на дрэвы ў фруктовых садах,
Захапляюць у сонечны дзень пазалотай
Ліставыя лясы, паркі ўсе ў гарадах.
Між фарб зелені рознай пакрытыя вохрай,
Залацеюць паляны, алеі, лугі,
А іржышча ржавеюць саломаю ссохлай,
І чакаюць, калі зааруць іх плугі.
Між янтарнай лістоты на дрэвах у парках
Праціскаецца промнямі сонечны бляск,
Праліваецца зверху праз кожную шпарку,
І глытае яго і трава і зямля.
Бо нядоўга яшчэ залаціцца бурштынам
Будзе лісце на дрэвах, кустах ліставых,
Дождж і вецер пакрые іх цёмнай пацінай,
І сарве іх, і кіне зусім нежывых.
І астануцца голыя толькі галіны,
І пасля іх прыкрые снег белы, як пух,
Так што толькі цяпер залатыя бурштыны
Выглядаюць на дрэвах, як з промняў кажух.
Так што толькі цяпер, як нам сонца заззяе,
Нас захопіць напэўна бурштынавы гай,
Так ідзіце глядзець, каб пачуць сябе ў раю,
І забыць пра нуду і жыццёвы адчай.
Мастакі хай ідуць маляваць скарб прыроды,
Каляровыя фарбы жывых янтароў,
Не праспіце фатографы добрай пагоды,
І здымайце нюансы лясоў і садоў.

**КРЫЛЛЕ**

Крылле прырода дала насякомым,
Мухам і пчолам і  ўсім матылькам,
І навучыла лятаць іх свядома,
Каб разагнаць па зямлі ўсіх кутках.
І засялілі яны лес, пячоры,
Рэкі, азёры, дрыгву, гушчары,
Многія з іх размнажаліся ў моры,
Іншыя месца знайшлі на гары.
Потым прырода дала крылле птушкам,
Нават агідным начным кажанам,
Ежай багатай для іх сталі мушкі,
І пачалася ў паветры вайна.
Птушкі вялікія, ястрабы,  совы,
Кані крыклівыя, ў горах арлы,
Не палявалі на мушак здаровых,
А нападалі на птушак малых.
Марылі людзі стагоддзі аб крылах,
Бачылі часта анёлаў у снах,
Міф аб разумным Дэдале стварылі,
Быццам ён лётаў на крылах, як птах.
Слаўны Ікар, сын міфічны Дэдала,
Быццам да сонца хацеў даляцець,
Воск растапіўся на крылах няўдалых,
Страціў ён пёры, разбіўся насмерць.
Мара людзей каб лятаць у паветры,
Доўга жыла толькі ў міфах і снах,
Людзі спачатку заставілі ветры,
Крылы круціць у млынах-ветраках.
Толькі нядаўна здзяйсніліся мары
Глянуць з нябёсаў уніз, быццам крук,
Людзі аднак падняліся пад хмары
Аэрастатам, не крыламі з рук.
Толькі прапелер на крылах з маторам
Вынесці мог над зямлю самалёт,
І чалавек паляцеў з ім угору,
Выканаў лепшы, як птушка, свой лёт.

Людзі даўно ўжо не толькі на крылах
Лётаюць лепш, як птушыны ўвесь свет.
Маюць ракеты іх боскую сілу,
Што далятаюць да іншых планет.

KAMUNIKAT.org

## ВЕРШ

У вершы складаю я словы ў радкі,
Збіраю, каб выйшла з іх новая фраза,
Як дзесь рэстаўратар бярэ чарапкі
І склейвае з іх нам разбітую вазу.
　　З радкоў я складаю паволі страфу,
　　Гляджу ці ў ёй згодныя рытмы і рыфмы,
　　Як лічбы вучоны запіша ў графу,
　　І спраўдзіць ці добрыя ў ёй лагарыфмы.
Страфа за страфою змяняецца ў верш,
Там дзе грубавата шліфую паволі,
Спраўджаю ўсе націскі ў строках найперш,
І іх паліpую я ўсе мімаволі.
　　Гляджу ці памылак я дзесь не зрабіў,
　　Ці слова чужога не ўставіў я дзесьці,
　　Ці косак паставіць я ў ім не забыў,
　　Ці ўсё выглядае кампактна нарэшце.
Як скульптар глядзіць на ўвесь свой гарэльеф,
Так я спаглядаю на вынікі працы,
Ці можна ўпрыгожыць яго, як калье,
Ці правільна ўсюды паставіў абзацы.
　　Ці тэму я добра ўсю ў ім апісаў,
　　Ці зразумелай яна іншым будзе,
　　Ці ў гуках пачуецца сэнс і краса,
　　Ці зацікавяцца тэмаю людзі.
І верш нарадзіўся, як плод мастака,
Яшчэ ён не будзе даваць мне спакою,
Ці гукі выглядваюць, як асака,
Ці будуць, як кветкі ўсіх цешыць красою.

## НОЧЧУ Ў АКНЕ

Ноч залівае вуліцу навокал,
Ды ўздоўж яе заззялі ліхтары,
Паблізу раптам голуб сеў на цокаль,
Загойдаўся ліхтарчык угары.
Асфальт, як люстра, ззяў святлом адбітым,
Замочаны крупінкамі дажджу,
Сляды машын, як рой александрытаў,
Іскрыліся ў вулічным вітражу.
З-за хмары выйшаў мысяц на хвіліну,
І паказаў за домам светлы сквер,
Убачыў я  высокую яліну,
І побач дома цёмнага партэр.
Адно акно адкрылася раптоўна,
І паказаўся ў ім дзявочы твар,
Да месяца ўсміхнуўся ён чароўна,
І зубы заблішчэлі, як янтар.
Да губ яна два пальцы прылажыла,
Паслала пацалунак цёплы ўверх,
Ды хмара месяц хутка ўвесь закрыла,
Схаваўся сквер, а з ім дзявочы смех.
Забарабаніў дожджык мне па шыбах,
І пацяклі па іх слёз ручаі,
І чорная бясформенная глыба
Закрыла краявіды ўсе мае.
І смутна стала мне што больш не ўбачу
Дзяўчыны, што з’явілася ў акне,
І смутна стала мне, што шыбы плачуць
Слязамі на  аконным палатне.

## УЦЁКІ АД СМУТКУ

Я сам адзін, дождж на дварэ ўжо суткі
Імжыць ці барабаніць мне ў акно,
Я ўцячы стараюся ад смутку,
Тэатр мяне не цягне, ні кіно..
    І тэлевізар мне ўжо надакучыў,
    Адна ў ім палітычная брахня,
    Паказвае ён многа ран балючых,
    Дзе ёсць тэрор, вайна і мітусня.
Ад смутку я камп'ютэр уключаю,
І забываю, што тварыцца за акном,
Сябе ўсяго я ў верш пераліваю,
П'янею ўвесь, як быццам выпіў ром.
    Буджу я сказы, каб яны крычалі
    Аб наваколлі нашым, аб бядзе,
    Аб тым, што нам улады абяцалі,
    Як подла ашукалі ўсіх людзей.
Як грабяць смела нашае багацце,
І як яго за бесцань прадаюць,
Хоць сыплецца на іх даўно пракляцце,
То чуюцца яны, як у раю.
    Ад іх гучыць хвальба і мнагаслоўе
    І абяцанкі чуць з усіх старон.
    Каб у дзяржаве знізіць беспрацоўе,
    То моладзь уцякае за кардон.
Калі пішу не адчуваю смутку,
Хандра ўцякла далёка ад мяне,
Прыемна чуюся ў сваім закутку,
Хоць звонку дождж грукоча па сцяне.

# ГІСТАРЫЧНЫЯ ПАДЗЕІ

## БЕЛАРУСЬ

Ты ў няволі суседскай жыла гадоў сотні,
Твой народ застаўлялі змяняць сваю веру,
Ён бароўся з усімі ў той час, як самотнік,
Апусціла эліта яго для кар’еры.
    Адракліся баяры ад родных карэнняў,
    Адышоўшы ад свят, ад традыцый і мовы,
    Перайшлі ў лагер ворага ўсе без сумлення,
    І народ свой аставілі жыць без аховы.
Прыгняталі яго ўсё мацней разам з ворагам,
І змушалі яго стаць хутчэй уніятамі,
Заплаціў твой народ за адпор вельмі дорага,
У вайне з езуітамі злымі, заўзятымі.
    Па загонах тваіх ішлі орды татараў,
    Спусташалі цябе і палякі і шведы,
    І палкі з-за Масквы набягалі, як хмары
    На твае гарады і прыносілі беды.
Як аставіў цябе прыгнятальнік заходні,
У той час, як цябе праглынуць ён стараўся,
Захапіў твой народ узурпатар усходні,
Быццам братам тваім быў заўжды, ён прызнаўся.
    Хутка ён паказаў, што такое ёсць брацтва,
    Ён прымусіў маліцца за царскую ўладу,
    У краіне засыпаў сдяды уніяцтва,
    Супакоіў паўстання гармат кананадай.
З-за яго і французы прайшлі ўсю краіну,
Па сабе астаўляючы смерць і пажары.
Як па іх зараслі ўжо травой каляіны,
Загудзелі нямецкія ў полі фанфары.
    І ў двадцатым вось веку ў васемнадцатым годзе
    У часы завірух і шалеючых войнаў
    Паявілася раптам надзея ў народзе,
    Што атрымае хутка сваю самастойнасць

Аб’явіла яе беларуская ўлада,
Што, як фенікс, паўстала ў нямецкай няволі,
Ды зусім незалежна, без чужога загаду,
Пачала сваю дзейнасць энергічна даволі.
Ды твае два суседзі яе разагналі,
Між сабой раздзялілі трактатам краіну,
Твой народ зноў яны ў кайданы закавалі,
І змушалі яго, каб забыў пра айчыну.
Адбіралі ў яго чалавечую годнасць,
Бессаромна разбурылі ўсе яго школы,
Разбіралі і нішчылі цэрквы, народнасць,
Да радзімы любоў называлі крамолай.
Камуністы сумесна з фашыстамі ў згодзе
Падзялілі ўсе землі суседняй дзяржавы,
Захапіў зноў цябе ўсю сусед твой на ўсходзе,
Для народу твайго, стаўшы катам крывавым.
Патрыётаў тваіх у тайгу высылалі,
Ці расстрэльвалі іх у турме, ў казематах,
Багацейшых сялян у Сібір выганялі,
І народ твой трымалі ў няволі за кратай.
Хутка лопнула дружба тваіх супастатаў,
Загрымелі на захадзе зноў бліскавіцы,
Вераломна нямецкі захопнік заўзяты
Перайшоў нечакана на ўсходзе граніцы.
Высыпалі з валля сотні бомб самалёты
На твае гарады, на чыгункі, на храмы,
Потым танкі пайшлі, секлі з іх кулямёты,
Рой снарадаў гудзеў над тваімі палямі.
Як настаў мірны час, зноў прыйшлі дні нягоды,
Пераможца хацеў твой народ роднай мовы
Адвучыць, каб забыў ён яе назаўсёды,
Каб не чуў ён, што мае чужыя аковы.
І амаль ён паўвека народ твой няволіў,
І стараўся, каб ён пазабыў сваю славу,
Гістарычныя дзеі і імкненне да волі,
І каб страціў ахвоту да ўласнай дзяржавы.
Засяліў ён краіну чужынцамі ўсходу,
І стараўся стварыць з іх чужую ўжо расу,
І з твайго дарагога айчыне народу
Ён зрабіў безідэйную, ціхую масу.

І калі незалежнасць прыйшла нечакана,
То народ не нацешыўся доўга свабодай,
Прэзідэнтам сваім сам ён выбраў тырана,
А тыран не цікавіцца лёсам народу.
Справядлівасць пры ім там знаходіцца ў коме,
А свабоду ў  турме ён трымае ў кайданах,
І не хоча аддаць ён улады нікому,
З дапамогай суседа, магутнага „хана”.
Не заўжды для тырана „хан” будзе зычлівы,
І, як чорт, ён пакажа яму біч і рогі,
Паглядзіць на яго з вышыні пагардліва,
І прыцісне з насмешкай яго да падлогі.

KAMUNIKAT.org

## ДВАЦЦАТЫ ВЕК

Дваццаты век – якія перамены
Прайшлі, як хвалі, па палях Еўропы!
Сусветныя дзве войны, як геены,
Людзей мільёны мучылі ў акопах.
　　Імперыі тры згінулі ад першай,
　　Паўсталі новыя зусім дзяржавы,
　　А голад не лічыў людзей памёршых
　　Пасля ў час рэвалюцыі крывавай.
Як грамадзянскія заціхлі войны,
То Беларусь дзве захапілі ўлады,
Якія да людзей яе спакойных
Зноў ставіліся з дзікаю пагардай.
　　Ад праваслаўнай адрачыся веры,
　　Ад роднай мовы ў Польшчы ўсіх змушалі,
　　Хто бунтаваўся, то таго ў карцэры,
　　Альбо ў Бярозу Картузскую ссылалі.
Іх цэрквы бурылі, рабілі з іх касцёлы,
Ці ў уніяцкія змянялі храмы,
Ім беларускія закрылі школы,
І да асветы замыкалі брамы.
　　На ўсходзе зноў калгасы і беспраўе,
　　Рэпрэсіі, прызывы да адзінства,
　　Партыйным – слава, а другім - бясслаўе,
　　Галеча, голад, страшныя злачынствы.
Там нішчылі і цэрквы і касцёлы,
Інтэлігенцыю ў гулагі заганялі,
Камуністычныя ілжывыя назолы,
Людзей надзеяю, як ядам, ачмуралі.
　　Ізноў вайна лавінай па Еўропе
　　Прайшла па землях нашых напачатку,
　　Прабегшы цераз Крыт і праз Радопы,
　　Да нас прыйшла ў смяротную ўжо схватку.
Зноў Беларусь разбурылі страшэнна,
Гарэлі сёлы, гарады, дубровы,
А страціла яна ў той час ваенны
Людзей сваіх загінуўшых палову.

Між імі знішчылі жыдоў мільёны,
Дзяцей, жанчын, і бедных і багатых.
Спалілі ў печах іх бесцырымонна
Нямецкія эсэсаўскія каты.
Фашызм загінуў грозна пад Рэйстагам,
Разліўся камунізм аж на Балканы,
Раслі навокал турмы і гулагі,
І расстаўлялі на людзей капканы.
Аднак лад новы знішчыў беспрацоўе,
Даў бедным ён бясплатную навуку,
Як бедны меў і талент, і здароўе,
Да творчых поспехаў атрымаць мог заруку.
І многа моладзі з сялян, з рабочых
Зрабіла навуковыя кар'еры,
Служылі ў арміі яны ахвоча,
Атрымаўшы там званне афіцэраў.
І камунізм дабраўся да Карэі,
І палавіну захапіў без бою,
І праз Кітай прайшоў віхром завеі,
І на В'етнам ён наступіў нагою.
Далей хацеў забраць усю Карэю,
Ды дзядзька Сэм прачнуўся з летаргіі,
І сотні самалётаў, батарэі
Гармат затрымалі яго стыхію.
Праз два гады гудзелі там гарматы,
Зямля стагнала з плачам ад бамбёжак,
Пакуль з Масквы смерць не забрала ката,
Які ў руках трымаў вайны аброжак.
Калі яго звалілі з п'едэсталаў,
Прыйшла надзея да людзей нарэшце,
Што кончыцца варожая навала,
І шугнуў бунт крывавы ў Будапешце.
Ды камунізм яшчэ ў той час меў сілу,
Ён у крыві ўтапіў усе паўстанні,
Аставіў там пажары і магілы,
Струмені слёз, праклёны і рыданні.
Як Сэм навёў парадак у Панаме,
То Кубай авалодалі марксісты.
Пасля прайграў вайну ён у В'етнаме,
Аддаў Лаос, Камбоджу камуністам.

Раней, як фенікс з попелу, радзіўся
Ізраіль у ісламскай Палесціне,
І новы фронт на цэлы век адкрыўся,
Грыміць ён, як вулкан, там на пустыні.
Разбіў Ізраіль Сірыю з Егіптам,
І з Іарданіяй, з малым Ліванам,
Па пройгрышных з жыдамі цяжкіх бітвах,
Арабы загудзелі несціхана.
Усе хто памагае там габрэям,
Ёсць ворагам смяротым для арабаў,
Да сённяшняй пары няма надзеі,
Што мір там завітае, як прываба.
І тэрарызм бязлітасны, шалены
Разліўся, як чума, па ўсёй планеце,
Фанатыкаў ісламскіх баталёны,
Як пустазелле, множацца на свеце.
Культурная мяцеліца ў Кітаі,
Якую рэвалюцыяй назвала
Улада з банды чатырох гультаяў,
Праз дзесяць год краіну зневажала.
Псіхічнаю хваробай заразілі
Атрады некрытычных хунвэйбінаў,
Якія прагай помсты і насілля
Дзяржаву давялі ўсю да руіны.
Свабоды захацелі нечакана
Пры камунізме чэхі і славакі,
Уціхамірылі іх хутка без пашаны
З-за Буга надышоўшыя ваякі.
Аднак пасля ім паламалі зубы
Муджахідуны з гор Афганістана,
І гэта быў пачатак ціхай згубы
Камуністычнага на ўсходзе велікана.
Калі ў баях яго слабела ўлада,
Пачулі людзі большую свабоду,
То загудзелі ў Польшчы серэнады
Да забастовак, бунту і нязгоды.
Свабодныя стварылі прафсаюзы
Рабочыя заводаў і сяляне,
Капіталізм, як шчупальцы мядузы,
Іх акружыў у бурным акіяне.

Іх падбухторваў моцна да насілля,
Каб хутка ўладу ўзяць без падрыхтоўкі,
Ды камунізм яшчэ меў столькі сілы,
Каб падавіць іх бунт і забастоўкі.
Аднак слабей ён чуўся з кожным годам
Ад цэнтрабежных сіл яго народаў,
Ад барацьбы за ўладу і нязгоды
Сярод яго партыйных „ваяводаў”.
Застой у эканоміцы дзяржавы,
Вялікія вайсковыя выдаткі,
Ды выбух у Чарнобылі крывавы
Былі яго агоніі пачаткам.
Дазволіў ён заходнім сатэлітам
З акоў яго прарвацца на свабоду,
І ў капіталістычную арбіту
Яны ўвайшлі ўжо без ягонай згоды.
І хутка у Еўропе сам загінуў,
Рэспублікам сваім даў самастойнасць.
І Беларусь тады і Украіна
Неспадзявана атрымалі вольнасць.
І дзядзька Сэм цяпер стаў пераможцам,
Ён раздае ўсім значаныя карты,
Каго не любіць – утапіў бы ў ложцы,
А для карысці зменіць крыўду ў жарты.
Не палюбіў ён сербаў на Балканах,
Дзяржаву іх ён расчляніў на часткі,
Пусціў на іх свае аэрапланы,
Аддаўшы Косава ў чужыя пасткі.
Ён пасварыў славян паміж сабою,
Нянавісць распаліў паміж сябрамі,
Каб выкупіць багацце іх без бою,
Каб імі кіраваць, як пастухамі.
Загінуў камунізм ва ўсёй Еўропе,
Ды эйфарыя прамінула хутка,
Бо віхар беспрацоўя бег галопам
Па гарадах усіх і ўсіх закутках.
Як прадалі заходнім бізнесменам
Амаль задарма фабрыкі, заводы.
Яны ж згнаілі іх, як кучы сена,
Каб канкурэнт ім не рабіў больш шкоды.

Пайшлі пратэсты і дарог блакады,
І дэманстрацыі сялян, рабочых,
Карупцыя на верхавіне ўлады,
Зладзейства яўнае і ўдзень, і ўночы.
З’явілася ўраз армія бяздомных,
Якая спала ў норах, на вакзалах,
І мафія бандытаў бессаромных,
Якая грабіла і нападала.
А пры канцы стагоддзя на Каўказе
Чэчэнцам захацелася свабоды,
Там смерч касіў людзей, як пры заразе,
Яшчэ там ад вайны дрыжаць народы.
Нагорны Карабах крывёй заліўся,
Калі Арменіі падаў ён рукі,
Ад Грузіі таксама аддзяліўся
Народ абхазскі пры гарматных гуках.
Астаўся камунізм яшчэ на Кубе,
У Азіі ён моцна акапаўся,
Ніхто не згадвае аб іхняй згубе,
Там моцным ён пакуль-што аказаўся.
Мінула так дваццатае стагоддзе,
Крывавае ад войнаў і ран цяжкіх,
Яшчэ ўспаміны будуць у народзе
Жыць праз вякі аб ім, як злыя казкі.
Сляды яго: канцлагеры, гулагі,
Магільнікі і бункеры, і доты,
Паэтамі напісаныя сагі,
Старыя у музеях самалёты.

KAMUNIKAT.org

**КАЛІ Б...**

Калі б Гаўрыла Прынцып куляй з пісталета
На вуліцы ў Сараеве нікога не крануў,
Не трэслі б кананады нашую планету,
Не бачыў бы ніхто сусветную вайну.
    І Аўстравенгрыя тады б не знала войнаў,
    І не адзін не адарваўся б ад яе народ,
    Эрцгерцаг Фердынанд у Вене б жыў спакойна
    З сваёю жонкаю быць можа і дзесяткі год,
Цар Мікалай з сям'ёй свайго б не зрокся трону,
І Ленін на чужыне б жыў, як псіхапат.
На свеце на франтах не згінулі б мільёны
Загнаных у акопы змучаных салдат.
    Падляша б не пазнала бежанства ў Расію,
    І потым не з'явіліся б туды бальшавікі,
    Народ наш не пазнаў бы страшную стыхію,
    Якая не забудзецца праз многія вякі.
Калі б дваццаць другога чэрвеня з-за Буга
Вермахт нямецкі не пачаў з саветамі вайны,
Знайшліся б многія дзесь за палярным кругам
Закутыя ў савецкія ў гулагах кайданы.
    Папалі б зноў другія ў стэпы Казахстана
    На голад, холад і галечу ў цяжкі час зімы.
    Нямецкі акупант нёс многім смерць і раны
    Ды ратаваў другіх ад сталінскай турмы.
Тады мяне і бацьку з маткай нечакана
Ён выратаваў з ссылкі дзесьці ў Казахстан.
Хаця пасля марыў мяне ў сваіх кайданах,
Я ўсё-ткі перажыў вайны ўсёй ураган.

# РАГНЕДА-ПОЛАЦКАЯ КНЯЖНА

## РАГНЕДА Ў КІЕВЕ

З паўночнай сталіцы правёў пераправу
Сам князь Уладзімір у Кіеў з аховай,
Забраўшы Рагнеду з малым Ізяславам
І першую жонку варажку Алову.
Ён іх пасяліў у вялікім палацы,
З якога забралі ўдаву Яраполка,
Жыве яна ў вёсцы між кветак акацый,
Гадуе там сына свайго Святаполка.
Яго ўжо раней князь назваў родным сынам,
А матку яго сваёй трэцяю жонкай.
Калі князь прыгожую ўбачыў жанчыну,
То браў у гарэм свой, як грошы ў скарбонку.
Рагнеда змірылася з норавам мужа,
Бо бавіцца з сынам яе быў ахвочы,
Калі ж за акном чуць было дождж і сцюжу,
То з ёю праводзіў ён дні ўсе і ночы.
У Кіеве хутка цяжарнаю стала.
Калі ж князь вярнуўся з паходу на Чэрвень[1],
Дзяўчынку малую яму паказала,
Якая пры ім закрычала, як певень.
Назвала Рагнеда дачушку Прадславай.
Так родную бабку калісь велічала,
Княгіню, якая Палоцкай дзяржавай
Сама кіравала разумна і ўдала.
Князь з ёю згадзіўся, дачкой любаваўся,
І цешыўся ёю амаль кожны вечар.
Да жонкі малодшай ісці забываўся,
Калі браў у рукі жывое малеча.
Прывёз у палац князь з паходу Багемку,
Чацвёртую жонку, прыгожую чэшку,
Рагнеда адчула ад рэўнасці стрэмку,
Пабачыўшы блізка яе твар, усмешку.

Таму падбухторвала сына малога,
Каб бацьку затрымваў ён доўга ў пакоі,
Каб бавіўся з ім у вайну і аблогу,
Каб казкі расказваў і ўласныя мроі.
А ноччу цягнула яго зноў у спальню,
Каб толькі яго не пусціць да Багемкі.
Хоць хутка пачула сябе зноў цяжарнай,
Любіла з ім быць у сябе ў час прыцемкі.
Аднак і Багемка цяжарнаю стала,
Тады гэта стала прычынаю сварак.
Ды хутка Рагнедзіна вёска паўстала,
Над рэчкай і з садам амаль два гектары.
Назваў Уладзімір Прадславінам вёску,
Ад імені першай каханай дачушкі,
Схапіў князь Рагнеду на новую лёску,
Яна гнеў забыла, пачуўшы спеў птушкі.
Аставіла жвава Багемку, Алову,
Пакоі ў палацы з гарэмам жаночым,
І пры развітанні ім брыдкага слова
Яна не сказала, зажмурыўшы вочы.

[1]Чэрвень-сённяшняя вёска Чэрмна ў павеце Тамашуў Любэльскі, калісь Крэпасці Чэрвеньскія над Гучвай і Бугам. Раней князь Алег іх далучыў да Кіеўскага княства, ды пры князі Яраполку польскі князь Мешка І іх заваяваў. Паводле Нестара князь Уладзімір адабраў іх ад палякаў і захапіў таксама горад Перэмышль і далучыў да Кіеўскага княства.

# РАГНЕДА Ў ПРАДСЛАВІНЕ

## І. ГАДЫ МАЦЯРЫНСТВА

Рагнеда цяжарная з сынам, дачкою,
Са службай, якую князь даў ім у вёску,
Знайшліся ўсе ў доме над Лыбедзь ракою,
Дзе блізка раслі і дубы, і бярозкі.
    Там свежы быў мёд, малако ад каровы,
    Гародніна, фрукты і ягады з лесу,
    І птушкі спявалі паблізу з дубровы,
    Не чула княгіня там зайздрасці, стрэсу.
Быў часта Ўладзімір там госцем у доме,
Хаця прыязджаў ён заўсёды з аховай,
Вазіў цераз рэчку дзяцей на пароме,
І сам аставаўся ўсю ноч без намовы.
    Ды раптам сабраўся ў паход ён на Вятку,
    Бо вяцічы не заплацілі даніны,
    Калі ж ён вярнуўся, Рагнеда з дзіцяткам
    Яму паказала другога ўжо сына.
Назвалі сыночка яны Яраславам,
Хаця ён не выглядзеў вельмі здаровым,
Багемка ж радзіла князю Вышаслава,
Радзіць памагала ў палацы Алова.
    Багемка з Аловай жылі вельмі згодна,
    Між імі ніколі не чулася звады,
    Алова старэйшай была і бясплоднай,
    Давала малодшай княгіні парады.
Ды з Вяткі прывёз княз чацвёртую жонку,
Яе пасяліў у палац бліз Аловы,
Тужыла яна тут за роднай старонкай,
Хоць стала цяжарнаю адначасова.
    І князь загадаў і Алове і службе
    Заўжды суцяшаць маладую дзяўчыну,
    Каб хутка забыла аб матцы, аб дружбе,
    Каб новую стала кахаць тут айчыну.

Багемку з дзіцём перавёз князь за горад,
Даў дом для яе, як Рагнедзе, бліз рэчкі,
Між нянек і службы жыла там бадзёра,
Забыла між імі паклёпы і спрэчкі.
Дайшло да Рагнеды, што дзвесце наложніц
Прывёз князь з вайны, і яны ў Берастове
Жывуць пад аховаю еўнухаў грозных,
На князя чакаючы напагатове.
Яна не паверыла казачным слыхам,
Што мала яму яшчэ пяць сваіх жонак,
Хоць рэўнасць кусала за сэрца ёй крыху,
Адкідвала хутка сваю падазронасць.
Ды князь апусціў іх раптоўна і скора,
Праз месяц пайшоў у паход на яцвягаў.
Праз год перамог. Да Балтыйскага мора[1]
Дайшоў, праявіўшы ў паходзе адвагу.
Рагнедзіны дзеці раслі і без князя,
Дужэлі спакойна, кахаючы матку,
Адзін Яраслаў не хадзіў сам ні разу,
Паралічам ног ён хварэў ад пачатку.
Калі князь вярнуўся з паходу на поўнач,
Удзячны за славу ў сваёй перамозе,
Хацеў даць ахвяру жывую раптоўна,
Статуям багоў пры сталічнай дарозе.
І рада баяраў і важных старэйшын
Рашыла між жыхараў жэрабя кінуць,
Каму пападзе,таму ў час найбліжэйшы,
Прыдзецца ад ката пры ідале згінуць.
І выцягнуў жэрабя хлопец з варагаў,
Які жыў з дзяцінства ў сям’і хрысціянскай,
І згінуў ён з бацькам у муках, знявагах,
У дзікім натоўпе хам’я, хуліганства[2].
Наведаў Прадславіна князь па паходзе,
Пражыў больш чым месяц з дзяцьмі, з Гарыславай,
Расказваў ён ім аб ваеннай прыгодзе,
Аб бітвах, засадах і грозных аблавах.
Расказам яго Ізяслаў захапляўся,
І часта яму задаваў ён пытанні,
І ў бацьку свайго ён тады закахаўся,
Чакаў на наступныя з бацькам спатканні.

Засмучаны князь быў хваробаю сына,
Якому ніхто памагчы не меў сілы,
Прывёз вельмі многа Рагнедзе бурштынаў,
Якімі яна яго ногі лячыла.
Як толькі князь выехаў летняй парою,
Рагнеда пачулася хутка цяжарнай,
Праводзіла час свой з дзяцьмі над ракою,
Любіла глядзець на бляск хвалі янтарнай.
І нянькі насілі на пляж Яраслава,
Трымалі ў пяску яго хворыя ногі,
Ужо гаварыў ён да іх шапялява,
Смяяўся да іх з іх турбот і знямогі.
Прывёз князь з вайны больш чым трыста наложніц,
Казаў у гарэм завезці ў Вышэгорад,
Прыехаў з аховай туды ўжо ў час позні,
Правесці свой час між дзяўчын дзесь з над мора.
Нядоўга ў гарэме пражыў у спакою,
Нядоўга яго забаўлялі дзяўчыны,
Даведаўся там, што дзесь племя малое
Радзімічаў раптам не плаціць даніны.
Сабраўшы ваяраў, пайшоў нечакана
Караць бунтароў са сваім ваяводам,
Разбіў Воўчы Хвост[3] іх на рэчцы Пяшчане,
Заставіў скарыцца, не сеяць нязгоды.
Зімой  ён вярнуўся, і жонка з-пад Вяткі
Сынка паказала яму, Святаслава,
І хутка Рагнеда радзіла дзіцятка,
Якое назвалі ўжо разам, Мсціславам.
Цяпер князь вясну ўсю пражыў з Гарыславай,
Ён з дзецьмі сядзеў, як не ездзіў у Кіеў,
Любіў быць з прыгожай дачкою Прадславай,
Насіў, цалаваў яе рукі і шыю.
Падрос Яраслаў і выпытваў ён бацьку
Пра бітвы яго і ў паходах прыгоды,
Ён слухаў расказ, як дзіцячую казку,
Пра лес, пра ваўкі, пра капрызы прыроды.
Не раз заглядаў на кані князь у горад,
Наведваў палац і сваіх жонак мілых,
Гасціў там час-два і вяртаўся бадзёра
Назад у Прадславіна, быццам на крылах.

Рагнеда адчула, што ён у палацы
Правеў час прыемна ля сына і жонак,
Аб гэтым яму не хацела прызнацца,
Каб ён не пабачыў яе падазронай.
Ды вось Дабрыня паявіўся раптоўна
Забраў Уладзіміра ён на нараду,
Пасля адплылі дзесь з аховай на чоўнах,
Здалёк паглядзеўшы на ўсіх са спагадай.
Зноў выбраўся князь у паход на балгараў,
Якія жылі блізка Волгі і Камы,
З наймітамі туркамі групы ваяраў
Забралі ў балгараў мячэці і крамы.
Аднак Дабрыня, паглядзеўшы, што боты
Палонныя ўсе на нагах сваіх маюць,
Сказаў Уладзіміру, каб ён без турботы
Тут мір заключыў найхутчэй з гэтай зграяй.
Бо потым яны ўсе адпомсцяць знявагу,
Тайком нападаць на Русь будуць знянацку,
Заўжды будуць клопаты з гэтай ватагай,
Лепш з імі жыць мірна, у згодзе, па-брацку.
Згадзіўся з ім князь, адпусціў ён палонных,
Узяў у іх клятву, што будуць жыць мірна,
Далі яму ў жонкі княжну з возам конным,
Якая жыццё ўсё яму будзе вернай.
Калі князь вярнуўся  зімою з балгаркай,
Застаў у палацы другога ўжо сына,
Якога ўжо матка назвала Мсціслаўкам,
Каб быў ён адважным і смелым мужчынам.
Князь вяцічку выслаў дзесь з дзецьмі за горад,
У вёску, дзе дом для яе збудавалі,
Каб матка і дзеці больш мелі прасторы,
Каб цешыў іх выгляд бялеючай далі.
Пасля князь з’явіўся ў Прадславіне ў санках,
Усевалад сын іх сустрэў яго з плачам.
Пры сыне ў калысцы забыў аб каханках,
На зіму астаўся ў Рагнедай на дачы.
Чатыры сыны там з дачкою Прадславай
Яго захаплялі зімой і вясною,
Кахаўся далей са сваёй Гарыславай,
Ён быў з ёй заўсёды ў чароўным настрою.

Пачулася летам княгіня цяжарнай,
Як ягады ела з кустоў барбарыса...
Паклікалі князя ў палац нечакана,
Бо жонка балгарка радзіла Барыса.
Балгарка не верыла ў ідалаў боскіх,
Была мусульманкай і ўжо ад дзяцінства
Яе рыхтавалі ў мячэце ля вёскі,
Да веры ў Аллаха, да мацярынства.
Яна гаварыла Ўладзіміру часта,
Што Бог ёсць адзін і жыве ён на небе,
А ідалаў творыць яго жрацоў каста
Для выгады ўласнай.Ім верыць не трэба.
Алова ўжо стала тады храсціянкай,
Атрымала імя другое, Мальфрыда,
Што стала для князя тады неспадзянкай,
Пачуў да яе напачатку агіду.
Ды потым яна пры яму нагадала
Аб бабцы яго, вельмі слаўнай княгіні,
Якая калісь хрысціянкаю стала,
І слава аб ёй у народзе не гіне.
Задумаўся князь і на радзе баяраў,
Сказаў, што навокал змянілі ўсе веру,
Цяпер Перуна ўсе там лічаць пачварай,
А іншых багоў пасяклі ўсіх сякерай.
,,Нам трэба знайсці – сказаў – новую веру,
Найлепшую выбраць у іншых народаў.
Бо Бог ёсць адзін і з нябеснай кватэры
Кіруе ён светам, людзьмі і прыродай.
Запросім паслоў ад усіх іншаверных,
Хай скажуць усё аб іх веры, малітвах,
Паслухаем іх і спакойна праверым,
Ці Бог ім памог у паходах і бітвах”.
Паслы прыязджалі ахвотна ў сталіцу
Ад камскіх балгараў, ад немцаў, ад грэкаў,
Аднекуль яўрэі прайшлі праз граніцу,
Адужалі горы, даліны і рэкі.
Яны ўсе хвалілі сваю толькі веру,
Абрады свае і законы, і храмы,
Малітвы ў святынях, звычаі, манеры,
Як трэба змагацца з людскімі грахамі.

Амаль два гады прыязджалі ў дзяржаву
Паслы і філосафы з розных напрамкаў.
Рагнеда радзіла дачку Прамíславу,
А Глеба радзіла ў палацы балгарка.
    А князь Уладзімір не мог выбраць веры,
    Якую бы мог ён прадставіць народу,
    І бога, ў якога хацелі б паверыць,
    Каб ідалаў знішчыць далі людзі згоду.
На радзе баяраў і членаў старэйшын
Рашылі паслоў сваіх выслаць усюды,
Разведаць на свеце, дзе Бог ёсць найлепшы,
Каб людзі ў Яго тут паверылі цуды.
    А дзеці ў Рагнеды раслі і дужэлі,
    Адзін Яраслаў меў турботы з нагамі,
    Ды ён самастойна ўжо сходзіў з пасцелі,
    І поўз па падлозе аднымі рукамі.
Ужо гаварыў ён да ўсіх зразумела,
Забавак меў многа і бавіўся імі,
Быў вельмі разумны, дасціпны і смелы,
І быў у Ўладзіміра сынам любімым.
    Рагнеда гардзілася дзецьмі і славай,
    Была яна самай каханаю жонкай,
    Бо князь з ёю раіўся з кожнаю справай.
    І з ёй захапляўся дзіцячай гамонкай.
Радзілі Ўладзіміра жонкі, дзяўчыны,
Ды летапісь дочак яго не назвала,
Успомніла толькі аб дачцы адзінай,
Бо ў Кракаве княжацкай жонкаю стала.
    Не ведаем толькі яе роднай маткі,
    Назвалі княжну Дабранегай-Марыяй,
    І знаюць гісторыкі ўсе без дагадкі,
    Што ў Кракаве жонкай была Казіміра.
Яна дала сына яму Баляслава,
Які каралём стаў  адважным і слаўным
Ён страціў карону за смерць Станіслава,
Епіскапа здрадніка польскай дзяржавы.

[1] Згодна з ісландскім летапісцам Стурлезонам князь Уладзімір апанаваў землі паміж Курляндыяй і Фінскім залівам, землі сённяшняй Латвіі і Эстоніі.

Гэтыя землі называлі Лівоніяй.
[2] Праваслаўная царква прызнала замучаных бацьку Фёдара і сына Яна святымі і святкуе іх згодна з праваслаўным календаром 12 ліпеня.
[3] Ваявода Ўладзіміра Воўчы Хвост разбіў Радзімічаў на рацэ Пяшчане, сёння ў Беларусі. Правы прыток Проні ў Магілёўскай вобласці.

KAMUNIKAT.org

## НАШЧАДКІ РАГНЕДЫ РАГВАЛОДАЎНЫ

## ПРАДСЛАВА І ПРАМІСЛАВА УЛАДЗІМІРАЎНЫ

Княжны Прадслава з Праміславай,
Дзве дочкі полацкай Рагнеды,
І сёстры князя Яраслава,
Прапалі ў Польшчы дзесь без следу.
Князя Ўладзіміра дзве дочкі,
Спаткаў страшэнны лёс дзявоцкі.
    Іх выдаў Святаполк пракляты
    У рукі князя Баляслава,
    Для цесця з Познаня з-за Варты,
    Які прыйшоў у Кіеў  жвава,
    Разбіўшы войскі Яраслава
    Над Бугам у баі крывавым.
Пасля паразы брат іх бойка
У Ноўгарад уцёк з дружынай,
Забраўшы жонку Святаполка,
А сёстры ворагу пакінуў.
Амаль не ўцёк ён да варагаў
Ад страху страціўшы адвагу.
    Князь Баляслаў тады ў нагонку,
    Ганца паслаў да Яраслава,
    Каб ён вярнуў для зяця жонку
    За Праміславу і Прадславу.
    Ды Яраслаў злы за паразу
    Ганца прагнаў, не даў адказу.
Князь Баляслаў, са злосці сіні,
Зрабіў наложніцай Прадславу,
І дзве княжны з сваёй дружынай
Завёз у польскую дзяржаву.
Іх след тады ў чужой краіне
У забыцці аб іх там гіне.

Ды лёс малодшай Прамíславы,
Быў быццам не такі ўжо зверскі,
Яе за згодай Баляслава
Узяў за жонку князь венгерскі.
Ён называўся Ласла Лысы,
І ён мангольскія меў рысы.
А прыгажэйшая Прадслава
Была знясслаўлена ў няволі,
Наложніцай у Баляслава
Служыла князю да сваволля,
А потым выдаў ён Прадславу,
За князя чэхаў Баляслава[1].
Пры рэчцы Альце пры пасёлках,
Князь Яраслаў з сваёй дружынай,
Разбіў дружыны Яраполка,
І Яраполк у Польшчы згінуў.
Князь Яраслаў, зняўшы Кіеў,
Забыў аб сёстрах на чужыне.
Назвалі Яраслава мудрым,
А князя Баляслава храбрым,
Ніякія не змогуць пудры
Закрыць іх подласцяў нахабных.
І скіпетр каралеўскі ўлады[2]
Не прынясе яму спагады.

[1] Быццам бы Баляслаў Храбры выдаў Прадславу
за князя Чэхіі Баляслава III Рудага (999-1002),
якога пасля асляпіў на Вавеле.
[2] Баляслаў Храбры ў 1025 г. атрымаў каралеўскую карону.

## ПЛАЧ ПРАДСЛАВЫ ЎЛАДЗІМІРАЎНЫ

О, брат ты мой бяздушны, Яраслаў!
Мяне з сястройаставіў ты ў няволі,
Нас захапіў наш вораг Баляслаў,
А ты дачку яго з сабой забраў,
І на яе ты нас не абмяняў,
Ты не хацеў нас абмяняць ніколі.
        Паслаў табе ганца князь Баляслаў,
        Епіскапа знаёмага ў краіне,
        Каб ты яму за нас дачку яго аддаў.
        Ты ж ад сябе епіскапа прагнаў,
        Нас у няволю ворагу прадаў,
        На ганьбу ў невядомай дзесь чужыне.
А я ж цябе любіла цэлы час,
Апекавалася ў Прадславіне табою,
Насіла на руках цябе не раз,
Як ты параліч ног меў, ці экстаз,
І бляяла для смеху як бакас,
Калі з табой сядзела над ракою.
        Вучыла я пасля хадзіць цябе,
        Калі ты сам адзін мог стаць на ногі,
        Была з табой, як чуўся ты слабей,
        І памагала, як магла, табе,
        Як ты кульгаў і мучыўся ў хадзьбе,
        І ў доме пераходзіў праз парогі.
Як з Турава вярнуўся Святаполк
І ў Кіеве ён стаў вялікім князем,
Баярам даў загад, як дзікі воўк,
Каб князь Барыс забіты быў у змрок,
Зрабіла я тады адважны крок,
Табе паслала вестку аб яго наказе.
        Тады сабраў ваяраў ты ў паход,
        Разбіў ты Святаполка ля Любеча,
        І цешыліся мы і ўвесь народ,
        Ды Святаполк уцёк да цесця і праз год,
        Прывёў палякаў і ўвесь дзікі зброд,
        Цябе ён напужаў пры Бузе ў калатнечы.

Без нас у Ноўгарад ты ўцёк тады,
Раней забраўшы Святаполка жонку,
І вось прайшлі ўжо доўгія гады,
Аб нас зусім забыў ты сапраўды,
Не знаеш нашых здзек, нашай бяды,
Наш цяжкі сум за роднаю старонкай.

KAMUNIKAT.org

# АНАСТАСІЯ ЯРАСЛАЎНА,[1] КАРАЛЕВА ВЕНГРЫІ

Прыгажосць і імя мела ад Рагнеды,
Полацкай княгіні, бабкі для яе,
З летапісаў розных зачарпнула веды,
А ад дзеда-князя здольнасці свае.
Золатавалосая да пояса з касамі,
Вабіла князёў усходняю красой,
Захапіўся ёю Эндрэ[2] князь з вусамі,
Што ў Кіеў з’явіўся з Венгрыі зімой.
З братам ен уцёк пасля перавароту,
Як дайшоў да ўлады дожа Арсеол[3],
І яго там доўга мучылі згрызоты,
Аж атрымаў ён у Венгрыі прастол.
Ён тады за жонку ўзяў Анастасію,
І ў сваёй айчыне ёй карону даў,
Цацак залатых навешаў ёй на шыю,
І яе па-свойму Агмундай назваў.
Венгры палюбілі светлую русінку,
І кахаў яе ўвесь час кароль Андрэй,
І хоць іх палац драўляным быў будынкам[4],
Кахаліся яны ў ім кожны год мацней.
Кнігі там былі ў сталіцы рэдкай з’явай,
У касцёлах чулі там адну латынь,
Аб Агмундзе хутка разышлася слава,
Як прыйшло з усходу да яе сто скрынь.
З гэтых скрынь Агмундзе выгрузілі лекі,
Летапісаў многа, многа іншых кніг,
З іх яна стварыла ў замку бібліятэкі,
І чытаць вучыла венграў з кніх сваіх.
Заснавала ў Тормаве і Вышаградзе,
Як ў Пячэрскай лаўры, два манастыры,
Дойлідаў радзімых, як была пры ўладзе,
З Кіева трымала на сваім двары.

Першы раз з іх дапамогай збудавалі
Мураваныя будынкі двух дамоў,
Аддала манахам іх і ўспаміналі
Там яны яе праз тысячу гадоў.
А епіскап Міклаш па яе загаду
Летапіс аб венграх з ёю напісаў,
Пра дынастыю венгерскую Арпадаў[5],
І як муж яе шчасліва панаваў.
Там яна ўрадзіла сына Саламона[6].
З імператара нямецкага дачкой
Ажаніла потым сына для кароны,
Забяспечыўшы яго перад вайной.
І Андрэй з Агмундай цешыліся тронам,
Аж брат мужа, Бэла, выставіўшы раць,
Забіў брата ў бітве і забраў карону,
І прыйшлося ёй на захад[7] уцякаць.
Тры гады жыла, як бедная сваячка,
Аж аб смерці Бэлы ёй данёс пасол,
І прыйшла назад яна зноў, як зямлячка,
Пасадзіўшы сына на стары прастол.

[1] Анастасія Яраслаўна – дачка вялікага кіеўскага князя Яраслава Мудрага, сына полацкай княгіні Рагнеды Рагвалодаўны і Ўладзіміра Святаславіча.

[2] Эндрэ – Андрэй I, пазнейшы кароль Венгрыі (1046-1060 г.).

[3] Венецыянскі дожа Пэтэр Арсеол, якога феадалы змоўшчыкі пасля смерці караля Іштвана I (Сцяпана I Святога) запрасілі на прастол, рвней асляпіўшы пляменніка Іштвана I, Вазула ў 1038 г.

[4] У той час у Венгрыі не было мураваных будынкаў, а толькі драўляныя.

[5] Арпады – дынастыя венгерскіх каралёў, якая панавала ад пачатку іх дзяржавы да 1301г. Кароль Андрэй I (1020-1060) быў з роду Арпадаў.

[6] Сын караля Андрэя і Анастасіі Ўладзіміраўны, Саламон (па-венгерску Шалман) узяў за жонку дачку імператара Германіі Генрыха III (1039-1056) Юдзіту,і сястру пазнейшага імператара Германіі Генрыха IV, і пасля смерці караля Бэлы I ў 1063 г, стаў каралём Венгрыі да 1074 г. Па смерці свайго мужа Саламона Юдзіта выйшла замуж за польскага князя Ўладзіслава Германа і радзіла яму тры дачкі.

[7] Уцякла яна з сынам у Германію да брата нявесткі Юдзіты, Генрыха IV, і там жыла да смерці караля Венгрыі, Бэлы I. Што далей з ёй сталася- невядома.

# ГАННА ЯРАСЛАЎНА,
# КАРАЛЕВА ФРАНЦЫІ

Другая дачка Яраслава[1],
І ўнучка прыгожай Рагнеды,
Атрымала гучную славу,
Карону ў французскай дзяржаве,
І мужа[2] ўдаўца дамаседа.
Яна аддала ў Рэймс з пасагу
Евангелле[3] з рускага храма,
І там на яго ўжо з адвагай
Аб вернасці мужу прысягу
Злажыла ў імгле фіміяма.
На гэты свяшчэнны гасцінец,
Манархі адбіўшы паклоны,
Праз многа вякоў у краіне
Прысягу на вернасць айчыне,
Складалі пры бляску кароны.
І рудавалосая дама
Зрабіла фурор у французаў,
Калі ля палацу пры браме
З распушчанымі валасамі,
Вітала, як боская муза.
Кахаў муж яе адмыслова,
Бо даў для яе многа ўлады,
І верыў ёй кожнаму слову,.
Падпісвалі разам умовы,
На ўсе з ім хадзіла нарады.
Ён быў каралём непісьменным,
Яна ж тады знала тры мовы,
Была ўсё ж яму ўвесь час вернай,
Таму быў ён мужам сумленным,
І здрад не было выпадковых.
Сыноў[4] трох яму нарадзіла,
Дала ім славянскія гены,
Двух мела здароўе і сілу,
А Роберт дзіцём у магілу,

Папаў з недахопу гігіены.
З Філіпам[5], з малым першым сынам,
Па смерці ўдаўца свайго мужа,
Яна кіравала краінай,
З Сан-Ліс, невялікай мясціны,
З прыгожага замку, як ружа.
Дала там загад, каб манашкам
Стварылі касцёл, і абацтва[6].
Жанчыны ў ім, быццам мурашкі,
Вякі пражылі ў працы цяжкай,
З малітвай за згоду і брацтва.
Маліліся за каралеву,
За сына Філіпа, за Гуга.
Аб ёй там малітвы і спевы
Нясліся, як ветра павевы,
Хвалілі яе ўсе заслугі.
Яе там ляпная фігура
З мадэллю ў руцэ ўсяго храма,
Праслухвала іх партытуру,
Глядзела ў кароне панура
Згары, як чароўная дама.
Там Ганна любіла банкеты,
І частыя танцы ў палацы
На чыстых бліскучых паркетах,
Язду на кані цёплым летам,
Турніры прад замкам на пляцы.
Любіла яна паляванні
На конях на дзікага звера,
Сядала зімой часта ў сані,
Каб ездзіць па снежным дыване
Са світаю дам, кавалераў.
У час аднаго палявання
Спаткалася ў лесе на конях,
З графам[7] высокага звання.
Пасля пачуццё іх кахання
Звязаў моцным шлюбам канонік.
Пратэст нават рымскага папы
У іх сужыцці не зашкодзіў,
Рауль граф Крэпі і Пероі
Быў моцны і голас сатрапы

У смех яго толькі прыводзіў.
І Ганна дала яму сына,
Хоць з першаю жонкай меў дзеці.
Каханаю жонкай адзінай
Жыла з ім у графскай мясціне
З дзіцём да хвілін яго смерці.
З Філіпам, як маці, ў сталіцы,
Пасля кіравала дзяржавай.
Сыны пахавалі ў грабніцы[8]
У склепе абацкай капліцы,
Рудую дачку Яраслава.

[1] Вялікі князь кіеўскі Яраслаў Мудры (1015 -1017) (1019 - 1054) Народжаны ў 978 г.

[2] Муж Ганны Яраслаўны Генрых I (1031 -1060) быў удаўцом. Яго першай жонкай была Мацільда Германская. Яна не мела дзяцей.

[3] Царкоўна-славянскае Евангелле, якое прывязла з сабою Ганна Яраслаўна, да XIV ст. .было неабходнай часткай абраду каранацыі французскіх каралёў.

[4] Ганна Яраслаўна нарадзіла Генрыху I трох сыноў: Філіпа, Роберта і Гуга. Роберт хутка памёр.

[5] Пасля смерці Генрыха I каралём стаў яго малы сын Філіп I (1060 – 1108). Тады каралева кіравала дзяржавай, хаця рэгентам быў Будуэн V.

[6] Стварыла яна ў Сан-Лісе абацтва св. Вікенція.

[7] Поўны тытул яго гучаў:Рауль III Вялікі, граф Крэпі і Валуа.

## ЛІЗАВЕТА ЯРАСЛАЎНА, КАРАЛЕВА НАРВЕГІІ

Унучка прыгожай княгіні Рагнеды,
Дачка Інгігерды[1], дачка Яраслава,
Пазнала Гаральда байца непаседу,
Які ў бітвах розных шукаў сябе славы.
Уцёк ён з Нарвегіі з бітвы крывавай,
Дзе згінуў яго брат кароль Святы Олаф[2],
Уцёк да сваячкі на двор Яраслава,
І там паказаў сваю смеласць, вясёласць.
Ён хутка з славяна-варажскай дружынай
Хадзіў у паходы далёка ў Судэты,
Калі ж быў у Кіеве, то безупынна
Яго захапляла княжна Лізавета.
Гаральд Яраславу занёс сувеніры,
Прасіў ён рукі Лізаветы[3] каханай,
Аднак Яраслаў адказаў яму шчыра:
„Яе будзеш мець, як багатым ты станеш”.
Яна пацвердзіла загад бацькі-князя,
Чакаць абяцала яго і быць вернай,
Ён ў доказ таго, што не чуе абразы,
На шыю павесіў ёй з золата грыўну.
Прасіў, каб насіла яе аж да часу,
Як вернецца ен да яе ўжо багатым,
І ёй прывязе многа перлаў, атласу,
І прыйдзе да бацькі яе з добрым сватам.
Сабраўшы дружыну ён шляхам варагаў
Паехаў у грэкі шукаць свайго шчасця,
І грабіў піратаў на моры з адвагай,
Ад іх адбіраў, што паспелі там ўкрасці.
Брыльянты і золата слаў ён у Кіеў,
Каб там да яго дачакалі звароту,
Княжна Лізавета з гасцінцам на шыі,
Чакала яго і не чула самоты.

Пасля ён пайшоў зноў Сіцылію грабіць,
Ён там чатырма гарадамі валодаў,
Галовы людзей, як галовы кальрабі,
Навокал ляжалі па ўсіх іх паходах.
Усё што награбіў паслаў ён ў Кіеў,
І зноў рабаваць ён плыве ў Палесціну.
Загад Яраслаў даў у храме ў Сафіі[4]
Прадставіць на фрэсцы сям'і дачку з грыўнай.
Гаральд Палесціну праходзіць без бою,
Іерусалім ён прабег, як паломнік,
Знайшоў Іардан, адпачыў над ракою,
Да Мёртвага мора дайшоў заваёўнік.
У Канстантынопаль вярнуўся з трафеям,
Даведаўся там, што пляменнік ягоны,
Сын Олафа Магнус[5] па доўгіх падзеях,
Нядаўна ў айчыне атрымаў карону.
Тады ён з сябрамі ўцякае ў Кіеў,
І ў Ноўгарадзе ён знайшоў Лізавету[6],
Забраў з ёй трафеі свае залатыя,
Дайшлі да Нарвегіі сонечным летам.
І Магнус шчаслівы прыняў свайго дзядзьку,
Уцешыўся ўбачыўшы там Лізавету.
Нядоўга тужыла яна там па бацьку,
У госці хадзіла, любіла банкеты.
Дачкі[7] дзве радзіла каханаму мужу,
Жылі вельмі згодна, спакойна, без сварак,
Зімою на санях каталіся ў сцюжу,
А летам у моры лавілі кальмараў.
Пры вузкім заліве стварыў горад Осла,
Сваю рэзідэнцыю ў ім ён паставіў,
Як Мангус памёр, то ён з жонкаю ўзнёсла,
Сваёй каранацыяй горад праславіў[8].
Калі каралём стаў пачаў ён набегі,
На блізкіх датчан нанасіў ён удары,
Заставілі іх пакарыцца нарвегі,
І міра прасіць, чуць няволі цяжары.
Калі ён пачуў, што ў англійскай дзяржаве
Памёр іх кароль Эдуард[9] познім летам,
Гаральд захацеў захапіць яе жвава,

З сабою ў паход ён узяў Лізавету.
Да бітвы дайшло на зямлі Альбіёна,
Там згінуў Гаральд ад стралы дзікай з лука,
Як трапіла ў горла яго, ён без стогна
Зваліўся з каня і памёр хутка ў муках.
Памерла там хутка дачка іх Марыя,
Калі прыняслі цела бацькі на вёслах,
Аднак Лізавета з дачкой, ледзь жывыя,
Іх целы забралі ў Нарвегію, ў Осла.
На мачце іх дракара чорны быў ветразь,
Які прадракаў ім бяду ад паразы,
Было чуць жалобныя гукі ў паветры,
І помсты жаданне і слёзы абразы.
З Гаральдам Суровым ,,Эпоха Вікінгаў”
Закончылася разам з ім назаўсёды,
Цяпер паказаць могуць часам на рынгах
Забытую іх барацьбу і паходы.
Жыцця час залечвае цяжкія раны,
Праходзіць усё, што было безнадзейным,
Пасля Лізавета зноў жонкаю стане
Вядомага дацкага конунга Свейна[10].
Другую дачку Інгігерду з пасагам
Яму прывязла Лізавета з паклонам,
І выдала замуж, як пішацца ў сагах,
За конунга Олафа з роду Свейнсона[11].

[1] Інгігерда – другая жонка вялікага князя Кіеўскага, Яраслава Мудрага (Кульгавага) (1017-1015)(1019 -1054) (Народжаны ў 978 г.), дачка караля Швецыі Олафа (955-1020).У Кіеве яна прыняля імя Ірына. Пам. у 1054 г.

[2] Святы Олаф – кароль (конунг) Нарвегіі (1016-1030), пасля паражэння з датчанамі збег з сынам Магнусам у Кіеў да Яраслава, аднак у 1031 г. вярнуўся без сына ў Нарвегію і ў бітве пры Скіклесце загінуў. Яго 15-гадовы брат Гаральд паранены ў бітве выратаваўся, залечыў раны і ўцёк у Кіеў да князя Яраслава.

[3] Лізавета Яраслаўна – трэцяя дачка князя Яраслава Мудрага (пасля 1024 – 1076 гг.).

[4] Сабор св. Сафіі у Кіеве пабудаваны пры Яраславе Мудрым, на фрэсках у саборы князь Яраслаў загадаў паказаць усю сваю сям’ю і дачку Лізавету з залатой грыўнай на шыі.

Сабор гэты ў Кіеве стаіць да сённяшняга дня.

[5] Магнус I, сын св. Олафа, караля Нарвегіі, атрымаў каралеўскую карону у 1041 г. і памёр у 1047 г.

[6] Лізавета Яраслаўна выйшла замуж за Гаральда ў Ноўгарадзе у 1043 або ў 1044 г.

[7] Лізавета радзіла Гаральду дзве дачкі: Марыю і Інгігерду.

[8] Гаральд III Суровы быў каралём (конунгам) Нарвегіі з 1047 па 1066 гг.)

[9] Эдуард Спаведнік, кароль Англіі (1042 -1066). Пасля яго стаў каралём Гаральд II. З ім 25 верасня 1066 г. сустрэўся Гаральд III Суровы і ў бітве пад Стэмфард-Брыджа загінуў. У 1066 г. войска Гаральда II разбіў князь нармандскі Вільгельм Заваёўнік і стаў каралём Англіі.

[10] Свейн Эстрыдсан, кароль Даніі (1047-1076).

[11] Олаф I Свейнсон, кароль Даніі (1086-1095).

## ІЗЯСЛАЎ УЛАДЗІМІРАВІЧ, КНЯЗЬ ПОЛАЦКІ

Рагнеды сын, сын полацкай княгіні,
Абараніў дзіцём яе ад смерці,
З мячом пры ёй, як паж святой багіні,
З рук бацькі не дазволіў ёй памерці.
    Тады той меч быў ад яго вышэйшы,
    Ды грозны від яго затрымаў бацьку,
    Сказаў яму, што ўжо ён тут не першы,
    І вострую ў руках ён мае цацку.
Раз’юшаны Ўладзімір страпянуўся,
Пабачыўшы сур’езны выгляд сына,
Ён акалеў, здзіўлёны усміхнуўся,
І злосць яму прайшла ў адну хвіліну.
    І на нараду склікаў князь баяраў,
    Параілі яны, каб дзеля сына,
    Ён не гразіў Рагнедзе смерці карай,
    А аднавіў ёй ейную айчыну.
Каб бацькаўшчыну князь аддаў Рагнедзе,
Туды каб выслаў з ёю Ізяслава,
І хай у Полаччыне разам недзе,
Яны князямі势 стануць іх дзяржавы.
    Тады ў вярхоўі Свіслачы Ўладзімір
    Рашыў, каб горад збудавалі пільна,
    Каб сыну гэты горад быў радзімым,
    Назвалі Ізаслаўлям, імем сына.
І там яго паслаў князь разам з маткай,
Рагнеду змусіў, каб чарніцай стала,
Яму палац даў, толькі напачатку,
Ягоным княствам матка кіравала.
    Яна была княгіняй і манашкай,
    Назвалася сама Анастасіяй,
    За сына працавала вельмі цяжка,
    І  цяжкі крыж у ёй звісаў на шыі.

Пасля забралі ў Полацк Ізяслава,
У горад збудаваны ў новым месцы,
Дайшла аб ім у Полацк відаць слава,
Каб да сябе яго хутчэй прывезці.
Асталася Рагнеда ў Ізаслаўлі,
І манастыр там першы заснавала,
І асяродак хрысіянства слаўны
З асветаю вяла там дасканала.
Князь Ізяслаў атрымаў эстафету
Павольнай барацьбы за незалежнасць.
Выконваючы дзедавы заветы,
Звяртаў увагу на князёў замежных.
Узмоцніў хутка гарадскую крэпасць
І ў княстве полацкім усе граніцы,
Каб аб набегах знаць хутчэй і лепей
Паставіў вышкі ўсюды і званіцы.
Пісьменнасць ён увёў ва ўсёй дзяржаве,
Першаасветнікам ён стаў вядомым,
Пісалі граматы пры Ізяславе,
І цэрквы будавалі і харомы.
Ягоны сувенір знайшлі  нядаўна,
Адціснутую на свінцу пячатку,
Пісьменнасці след старажытны, слаўны,
Якую ў княстве ўвёў ён напачатку.
На граматах напісаных  у княстве
Пячаткі дадавалі на дзягужках,
І людзі багацелі і ў багацці
Культура развівалася ў іх хутка.
На жаль памёр ён раптам ад хваробы,
Сынам аставіў моцную дзяржаву,
Па смерці маткі год насіў жалобу,
Аставіў княства сыну Усяславу.
Князь Уладзімір не паслаў у Полацк
Нікога больш, калі  пачуў аб смерці.
Хоць Усяслаў тады яшчэ быў кволы,
І ад хваробы хутка мог памерці.
І два гады там Усяслаў быў князям,
Памёр ён хлопцам, не зазнаўшы славы,
А ў Полацку стаў панаваць адразу
Князь Брачыслаў, другі сын Ізяслава.

# ВЕРШЫ Ў АЛЬБОМЫ

## ГЭТА НЕ МРОЯ

*Дар'і М.*

Утаплюся я ў тваіх абдымках,
Я цябе, як кокан, абаўю.
Станем неразрыўнаю адзінкай,
Пры чароўным райскім ручаю.
Нас ахопіць асалоды радасць,
І да піка радасці ўзнясе.
Целы запяюць нам серэнаду
Аб каханні, шчасці і красе.
Сэрцы будуць біцца, як тамтамы,
Кроў у жылах будзе нам кіпець,
Вочы будуць радавацца з намі,
Нашы вусны будуць песні пець.
Буду цалаваць цябе я ўсюды:
Вусны, вочы і прыгожы твар,
На якім ужо з'явіўся цудны
Веснавы карычневы загар.
Буду гладзіць я сваёй рукою
Чорныя, як вугаль, валасы,
Буду слухаць у жывым настрою
З губ тваіх раскошы галасы.
У абдымках радасных з табою,
Губ гарачых чуючы масаж,
Буду чуць, што гэта ёсць не мроя,
Буду знаць, што гэта – не міраж.
Буду знаць, што гэта – рэчаіснасць,
Цешыцца гарачнасцю страсцей.
Так хацеў бы я тут непахісна,
Быць з табой, як можна, найчасцей.

Сакавік 1948 г. Ст. Чаромха.

# ПРЫЛІВЫ КАХАННЯ

*Марыне Ф.*

Бываюць між намі прылівы кахання,
Як мае прылівы вясною рака.
Патокі пачуццяў плывуць без чакання,
Струменямі ў сэрца ўбягаюць сцішка.
        Тады ўсё навокал я бачу прыгожым,
        Усмешку тваю ўсю з румянцамі шчок,
        Твой позірк чароўны мяне заварожыў,
        І крыжык на шыі, яго ланцужок.
Я цешуся вельмі тваёю адвагай,
Што носіш адкрыта на шыі яго,
Зусім не баішся ні кпін, ні знявагі,
А нават рэпрэсій партыйных багоў.
        Цябе сустракаю заўжды з хваляваннем,
        Баюся, каб нехта не скрыўдзіў цябе.
        З найбольшай ахвотай іду на спатканне,
        Калі ты запросіш мяне да сябе.
Абдымкі твае, як таемны наркотык,
Мяне ап’яніў і з табою звязаў.
А пры пацалунках  раскошны губ дотык
Уводзіў раптоўна ў прыемны азарт.
        Пяшчоты твае і гарачае цела,
        З тварам прытуленым мне да грудзей,
        Які, быццам ружа пры мне чырванела,
        А зрэнкі ў ім ззялі ў сватле ўсё ярчэй.
Мы чулі тады, што ўсе нашы жаданні
Прад намі тут сталі, як воблік жывы.
І толькі ў гарачых прылівах кахання
З акон ахалоджваў нас подых Нявы.

Снежань 1948 г. Ленінград.

## ПОЎДЗЕНЬ ЛЯ ЗАЛІВА

*Алесі Н.*

Поўдзень гэты ля заліва
Будзем помніць мы заўсёды:
Промні з неба, як з крэсіва,
З неба сыпаліся ў воды.
    Жабы квакалі навокал,
    Заглушаючы спеў птушак.
    Прыляглі мы ля затокі,
    На пясчаны лапік сушы.
Мы на берагу ля мора,
Тварамі да белай пены,
Інстытут забылі скора,
І залікі ў душных сценах.
    Хваля плёскала паблізу,
    У праменнях сонца ззяла,
    Вольха побач, як маркіза
    Нас ад сонца засланяла
Не цікавілі нас грошы
У абдымках, пацалунках.
А паблізу пах пакошы
Быў нам мілым падарункам.
    Мы сабе глядзелі ў вочы,
    І на мора акружэнне,
    Аж раптоўна цемра ночы
    Нас прыкрыла чорным ценем.
І калі на небасхіле
Асвятліў нас месяц поўняй,
Мы ў сябе пачулі сілу,
Каб дайсці дамоў спакойна.

Чэрвень 1949 г. Ленінград.

# ІЗНОЎ Я СУСТРЭЎСЯ З ТАБОЮ

*Мусі П.*

Ізноў я сустрэўся з табою,
Пасля прымусовай разлукі,
У светлым знаёмым пакоі
Пад вальса чароўныя гукі.
    Мы зноў у абдымках зліліся,
    Сасмяглыя доўгім чаканнем,
    І вусны ў нас хутка сышліся
    Ад моцных пачуццяў кахання.
Глядзеў я ў чароўныя вочы,
Што бліскалі яркай зарніцай,
І, як пад гіпнозам, да ночы
Я імі не мог надзівіцца.
    Я іх цалаваў безупынна
    Пры танцах, на светлым дыване,
    Я чуў у час гэты няспынна
    Прыгожых грудзей хваляванне.
І гэта дало нам надзею,
Што ўжо нам не знішчаць кахання,
Ні водгукі дзіўных падзеяў,
Ні новыя дні расставання.
    Падтрымліваць будуць нас лісты,
    Даваць нам надзею ў чаканні,
    І веру, што дзень урачысты
    Зноў прыйдзе пры нашым спатканні.
Сустрэнемся зноў мы, як сёння,
Як скончыцца ў нас час разлукі,
І будзем мы цешыцца поўняй
Кахання пад музыкі гукі.

Ліпень 1949 г. Шчэцін.

# МАГУ ЦЯБЕ ТОЛЬКІ ЗРАЗУМЕЦЬ

*Таісе К.*

У сукенцы ружовай без пояса,
Ля мяне ты паблізу прысела,
Аб каханні напружаным голасам,
Гаварыць стала ціха, нясмела.
    Недавер'е ў цябе адчуваецца
    Да надзейнасці нашых спатканняў,
    Што жыццёвы нам лёс не ўсміхаецца,
    І тараніць дарогу кахання.
Што любоў тут у нас незайздросная:
Нас раздзеляць без волі і згоды,
Непрыемнаю сілаю злоснаю,
І раскінуць пасля назаўсёды.
    І я слухаю моўчкі, настойліва,
    І ўжо веру ў тваё ўсё прароцтва,
    І шкада, што закон так устойліва
    Абражае твой гонар дзявоцтва.
Ты сваёю фігураю тонкаю,
Чараваць нас тут можаш даволі,
Каб праўдзіваю стала ты жонкаю
Чужаземца - табе не дазволяць.
    Ці з табой мы яшчэ дачакаемся,
    Што калісь для нас зменяць законы?
    Мы цяпер тут з табой сумняваемся,
    Што я буду тваім нарачоным.
І амбіцыя, годнасць дзявочая
Пагадзіцца з законам не можа...
Ды ўжо позна і слова прарочае
Нам нічога тут больш не паможа.

Снежань 1949 г.Ленінград.

## ЦАЛУЙ МЯНЕ

*Раісе М.*

Не будзь такая смутная і злая,
І да сябе мяне зноў прытулі,
Забудзь усе  маркоты, дарагая,
І смейся, як смяялася калісь.
    Цалуй мяне абняўшы без прыпынку,
    Заўжды так цалавала ты мяне,
    І не сумуй са мною ні хвілінкі,
    І смейся, як смяялася раней.
Люблю твой смех, карычневыя вочы,
І пацалункі мягкіх цёплых губ,
Чароўны від грудзей тваіх жаночых
І з валасоў тваіх завіты чуб.
    Люблю твой голас альтавы і звонкі,
    Калі спяваеш песні ў цішыні,
    Калі жартуеш у часы гамонкі,
    І ў зрэнках ззяюць яркія агні.
Люблю твой стан, прыгожы, гібкі, зграбны
І грацыю абдымкаў і пяшчот,
Люблю твой позірк мілы і павабны,
Бялеючых жамчужын поўны рот.
    Люблю з табою быць, калі захочаш,
    Гуляць з табой па горках снегавых,
    Люблю з табой праводзіць час ахвоча
    Над кнігамі ў пакоі ля Нявы.
Так не сумуй, цалуй мяне ў абдымках,
Як цалавала ты мяне заўжды,
Цалуй мяне ўвесь час, без адпачынку,
І смутак свой забудзеш сапраўды.

Люты 1950 г. Ленінград.

## СУСТРЭЧА Ў ПАЎЛАЎСКУ

*Аксане Н.*

Ты прыехала аж з Украіны,
Каб у парку сустрэцца са мной.
Валасы і лісцё на  галінах,
Залаціліся разам з табой.
        Твар твой мілы з чароўнай усмешкай,
        Заварожыў тут сэрца маё,
        І мы ў парку знайшлі зараз сцежку,
        Над забыты малы ручаёк.
Там над намі шаптаў толькі вецер,
Ён быў сведкам тут нашых спакус,
Ды і птушкі, як шумныя дзеці,
Шчабяталі нязнаны нам блюз.
        Там ніхто нас тады не трывожыў,
        Пачуццё нас з’яднала ўдваіх,
        І тады нас ніводзін прахожы
        Не мог вырваць з абдымкаў жывых.
Зачараваны мілым усмехам,
Пацалункам цябе абдарыў,
І пабачыўшы ў зрэнках уцеху,
Я яго многа раз паўтарыў.
        Пацалункі гарэлі на вуснах,
        І ад часу да часу быў жарт,
        Не было ў нас тут думкі спакуснай,
        Каб забыцца і ўпасць у азарт.
І гудок абвясціў нам, што трэба
Сабірацца ісці на цягнік,
Бо сцямнела над намі ўжо неба,
І пастрашыць нас мог лесавік.

Кастрычнік 1950 г. Ленінград.

## ЛЮДМІЛА

*Людміле Р.*

Мая Людміла, дарагая,
Зноў сустракаюся з табой,
Цябе раскошна абдымаю,
Цвіце ў нас дружба і любоў.
Нам пагражала ўжо расстанне.
Бо зайздрасць жоўцьцю заліла
Хвіліны роскашы кахання,
Іх стала рэзаць, як піла.
Ты доўга не магла прабачыць,
Што быў у парку я з другой.
Ды пацалунак мой гарачы
Змяніў няпэўнасці настрой.
Цяпер мы зноў гуляем разам
Па снежных Карпаўкі грудках
І ззяе ў сонцы нам алмазам
Унізе мёрзлая рака
Бываем мы ў кінатэатрах,
Або заглянем зноў на баль,
Ці ў дзень марозны дзесь у парках
З табой гартуемся, як сталь.
З табою часта ў інстытуце
Сядзім за партаю адной.
І дружбы мілыя пачуцці
Даюць нам радасць і спакой.
Мы часам у тваім пакоі
Глядзім на месяц з-за акна,
І марым снежнаю зімою,
Калі нам з'явіцца вясна.

Снежань 1950 г. Ленінград.



Індыя. Аўтар у храме джэйнаў у Параснашу



Індыя. Варанасі. Аўтар ля храма Дургі.

# Змест

УСПАМІНЫ
Прадказанне .................................................... 5
Бельск-Падляшскі ............................................ 7
Хацеў я зноў цябе спаткаць ............................ 9
Забытыя ........................................................... 10
Сіла бацькоўскай зямлі .................................... 11
Сірата і яе матка ............................................... 12
Пах роднай зямлі ............................................. 13
Хвароба Падляшша ......................................... 14
Берлінская сцяна .............................................. 16
Поўня месяца ................................................... 17

НА ЗЛОБУ ДНЯ
Усявышні даў нам ............................................ 18
Які стаў страшны гэты свет ............................ 20
Безразважная нянавісць .................................. 21
У чатырох сценах ............................................ 23
Любоў да людзей ............................................. 24
Перамены ......................................................... 25
Наіўныя ............................................................ 26
Так многа навакол маны ................................. 27
Турботы маладажонаў ...................................... 28
Утапістам ......................................................... 29
Калі б да нас прыйшоў Хрыстос ..................... 30
Віфліем ............................................................ 31
Сумленнасць палітыкаў .................................. 32
Грахі ................................................................. 33

ЗАХАПЛЕННІ
Радасць інжынера-пенсіянера ......................... 35
Мая мара ........................................................... 37
Новы ранак у сяле ............................................ 38
Два каты ........................................................... 39
Метэор ............................................................. 40
Юнацтвам ззяла ранняя зара ............................ 41

Дасканаласць .................................................... 42
Музыка прыроды ............................................. 43
Гімн электронам .............................................. 44
Разнароднасць лесу ......................................... 45
Лесвіца ............................................................. 46
Бабіна лета ўцякло ........................................... 47
Янтарная восень ............................................... 48
Крылле ............................................................. 49
Верш ................................................................. 51
Ноччу ў акне ..................................................... 52
Уцёкі ад смутку ............................................... 53

ГІСТАРЫЧНЫЯ ПАДЗЕІ
Беларусь ........................................................... 54
Двадцаты век .................................................... 57
Калі б... ............................................................. 62

РАГНЕДА- ПОЛАЦКАЯ КНЯЖНА
Рагнеда ў Кіеве ................................................ 63

РАГНЕДА Ў ПРАДСЛАВІНЕ
І. Гады мацярынства ........................................ 65
НАШЧАДКІ РАГНЕДЫ
РАГВАЛОДАЎНЫ
Прадслава і Праміслава Ўладзіміраўны .......... 72
Плач Прадславы Ўладзіміраўны ..................... 74
Анастасія Яраслаўна, каралева Венгрыі .......... 76
Ганна Яраслаўна, каралева Францыі ............... 78
Лізавета Яраслаўна, каралева Нарвегіі ............ 81
Ізяслаў Уладзіміравіч, князь Полацкі ............. 85

ВЕРШЫ Ў АЛЬБОМЫ
Гэта не мроя .................................................... 87
Прылівы кахання ............................................. 88
Поўдзень ля заліва ........................................... 89
Ізноў я сустрэўся з табою ................................. 90
Магу цябе толькі зразумець ............................. 91
Цалуй мяне ...................................................... 92
Сустрэча ў Паўлаўску ...................................... 93
Людміла ........................................................... 94

БІБЛІЯТЭКА
Беларускага літаратурнага аб'яднання
„БЕЛАВЕЖА”

Серыя заснавана ў 1990 **г.**

Кніжка пяцьдзесят сёмая

Рэдактар
*Віктар Швед*

© Copyright by Dymitr Szatyłowicz 2007

ISBN 978-83-60534-50-2

PRYMAT

Mariusz Śliwowski
Białystok, Ul. Zwycięstwa 26C lok 7
Tel. 869 14 87, 0602 766 304
www.prymat.stnet.pl, e-mail: prymat@stnet.pl

KAMUNIKAT.org